Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЖНІВЕНЬ 4 1932 г. № 173 (4425).

Год выдавьня XV

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—сто нумароў «Рабселькора». А. ДЖЭЛЮК, А. ЮФЭ, Ю. ТАКАРЧУК,—Два юбілеі (2 і 3 стар.).

Ушчыльненыя тэрміны ўборкі—адна з асноўных умоў збору збожжа бяз страт. Раўняцца па Пятрыкову і Камарыну якія сваячасова скончылі ўборку азімых (1 стар).

У адзнаку юбілею «Зьвязды» віцебскія пралетары абяцаюць павысіць тэмпы сваёй работы (2 стар.).

Уцільцэху—максымум увагі (3 стар.).

Бранявікі, кулямёты, газавыя бомбы для задушэньня антываенных дэманстрацый у Варшаве (4 стар.).

Галодны паход беспрацоўных на Белавеж (4 стар.).

Паражэньне стаўленьнікаў ангельскага імпэрыялізму (4 стар.).

СТО НУМАРОЎ „РАБСЕЛЬКОРА“

Сёньня пралетарская грамадзкасьць СССР адзначае выхад сотага нумару «Рабселькора»—кіруючай газэты па пытаньнях раённага, нізавога друку і рабселькораўскага руху.

Было-б няправільна гэты юбілей зводзіць да юбілею толькі адной газэты.

Юбілей газэты «Рабселькор»—гэта па сутнасьці баявое сьвята ўсяго рабселькораўскага руху і нізавога друку, усёй пралетарскай грамадзкасьці БССР.

Знамянальна і тое, што **ЮБІЛЕЙ «РАБСЕЛЬКОРА» МЫ АДЗНАЧАЕМ НАПЯРЭДАДНІ 15-ГОДЗЬДЗЯ «ЗЬВЯЗДЫ» І ПЯЦІГОДЗЬДЗЯ ПЕРАХОДУ ЯЕ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ.**

Гісторыя «Зьвязды»—гісторыя рабселькораўскага руху БССР, яго бурнага росту, пад кіраўніцтвам партыі, узьняцьця яго ролі ў сацыялістычным будаўніцтве.

Самы факт арганізацыі газэты «Рабселькор» у студзені мінулага году зьявіўся простым вынікам бурнага ўздыму, далейшага магутнага росту рабселькораўскага руху і нізавога друку, што патрабавала ад партыйных арганізацый і рэдакцый газэт яшчэ большага ўмацненьня і канкрэтызацыі кіраўніцтва рабселькораўскім рухам на аснове навуковага ажыцьцяўленьня пастановы ЦК УсеКП(б) ад 16 красавіка 1931 году.

Пры сваёй арганізацыі «Рабселькор» меў багацейшы вопыт, бальшавіцкія традыцыі «Зьвязды»—органу ЦК КП(б)Б, вопыт яе самай шчыльнай сувязі з масамі, разгортваньня палітыка-выхаваўчай работы з рабселькорамі.

Адказьнейшы пэрыяд арганізацыі газэты «Рабселькор»—у пачатку трэцяга рашаючага году пяцігодкі—паклаў адбітак на ўсю яе практычную работу.

Партыя ў гістарычнай пастанове свайго ЦК ад 16 красавіка 1931 году падкрэсьліла вялізарна-ўзросшае значэньне рабселькораўскага руху, як актыўнага праваднікa генэральнай лініі партыі, што «рабселькоры становяцца пад кіраўніцтвам партыі арганізатарамі мас для справы сацыялістычнага будаўніцтва, выкананьня вытворчых плянаў і разгорнутага наступленьня на клясавых ворагаў».

Пэрыяд разгорнутага сацыялістычнага наступленьня паставіў перад рабселькорамі новыя, больш складаныя задачы: «глыбей уваходзіць ва ўсе важнейшыя пытаньні сацыялістычнага будаўніцтва на ўсіх яго вучастках», «канкрэтызаваць свае задачы, прыстасоўна да розных вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва, на якіх яны працуюць»

Пад знакам мабілізацыі і арганізацыі рабселькораўскіх мас на рэалізацыю гэтай гістарычнай пастановы ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху і працавалі апошнія паўтары гады партыйныя арганізацыі БССР і іх друк, у тым ліку і новаарганізаваная, адзіная ў БССР кіруючая рабселькораўская газэта—«Рабселькор».

За гэты час, як гэта адзначана ў дакладах на ліпеньскім пленуме ЦК і ЦКК КП(б)Б, мы дабіліся раду бясспрэчных і значных посьпехаў у справе перабудовы рабселькораўскага руху, у справе разгортваньня сеткі раённага друку і нізавых насьценных газэт на прадпрыемствах. Вялікую ролю ў гэтым адыгрывае і выданьне ў БССР спэцыяльнай газэты па пытаньнях рабселькораўскага руху, раённага і нізавога друку—«Рабселькор».

Сакратар ЦК КП(б)Б **тав. Жаброўскі** ў сваім дакладзе на ліпеньскім пленуме ЦК і ЦКК КП(б)Б спэцыяльна падкрэсьліў значэньне газэты «Рабселькор», сказаўшы:

«Неабходна асабліва падкрэсьліць тыя вялікія задачы, якія ў гэтай галіне ўскладзены ЦК КП(б)Б на газэту «Рабселькор»—орган Культпропу ЦК КП(б)Б, выданьне «Зьвязды». Забясьпечыць удзел партыйнага актыву ў гэтай газэце, шырока распаўсюдзіць гэту газэту, забясьпечыць далейшае павышэньне якасьці гэтай адзінай у БССР кіруючай газэты па рабселькораўскіх пытаньнях,—такава адна з нашых задач, пасьпяховае вырашэньне якой, бязумоўна, дапаможа партыйнаму актыву лепш ажыцьцявіць кіраўніцтва і дапамогу нізавому друку і рабселькораўскаму руху».

Усесаюзны конкурс нізавых газэт па лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, абвешчаны «Правдой» у кастрычніку мінулага году, быў узначален у БССР партыйнымі арганізацыямі, праводзіўся пад абвешчаным ЦК КП(б)Б лёзунгам, што «справа конкурсу «Правды»—справа ўсёй пралетарскай грамадзкасьці БССР».

Пры непасрэдным практычным кіраўніцтве «Зьвязды» і «Рабселькора» гэты конкурс, узначалены па мясцох партыйнымі арганізацыямі, даў значныя вынікі, значна ўзьняў ролю нізавога друку і рабселькораў у сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі. За гэты час на вёсцы ў некалькі разоў вырас колькасна і ўмацаваўся якасна нізавы друк калгасаў, саўгасаў і МТС. Вырасла новае зьвяно бальшавіцкага друку—брыгадныя пасьценгазэты.

Сацыялістычнае спаборніцтва нізавога друку і рабселькораў БССР, Савецкай Украіны і Паўночна-Каўказкага краю на лепшае правядзеньне конкурсу «Правды» зьявілася магутным сродкам яшчэ большай мабілізацыі нізавых газэт і рабселькораў на барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Сталінскі паход фабрычна-заводзкага друку, які праводзіўся «Зьвяздой», «Рабселькорам» і ЦСПСБ, адыграў значную ролю ў справе перабудовы работы нізавога друку на фабрыках і заводах, наближэньні яго да цэхаў, агрэгатаў і вытворчых брыгад, у справе канкрэтызацыі задач рабкораўскай работы, прыстасоўна да розных вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва.

З актыўнай дапамогай газэты «Рабселькор» у апошні час наладжваецца работа на адным з важнейшых і ў той-жа час адстаючых вучасткаў—дарожным будаўніцтве.

Сіла і значэньне рабселькораўскага руху ў тым, што ён адлюстроўвае, зьяўляецца вынікам бурнага творчага ўздыму рабочых мас і працоўнага сялянства.

Сіла і значэньне рабселькораўскага руху ў тым, што ён працуе пад непасрэдным кіраўніцтвам партыі, зьяўляецца актыўнейшым арганізатарам мас для справы сацыялістычнага будаўніцтва, надзейным памочнікам партыйных арганізацый убарацьбе за генэральную лінію партыі, на два фронты, супроць правага апартунізму—галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левых» загібаў і прыміранцтва да ўхілаў.

Адзначаючы бясспрэчныя посьпехі, якія мы маем у разгортваньні рабселькораўскага руху ў БССР, было-б глыбока памыльковым ня бачыць тых, часам даволі буйных, недахопаў, якія ёсьць у практычнай рабоце.

І на сёньняшні дзень яшчэ ў радзе раёнаў адсутнічае сыстэматычнае, штодзённае, канкрэтнае кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькорамі з боку партыйных арганізацый і рэдакцый газэт, не праводзіцца імі сярод рабселькораў глыбокая палітвыхаваўчая работа.

Як буйнейшы недахоп у радзе рэдакцый газэт, трэба адзначыць іх пяўважлівыя адносіны да рабселькораўскіх лістоў, няўменьне змагацца за дзейнасьць кожнага рабселькораўскага допісу, кожнай скаргі рабочага, калгасьніка, працоўнага-аднаасобніка.

Значным недахопам шмат якіх насьценных газэт зьяўляецца нізкая якасьць матар'ялу, што зьмяшчаецца, няўменьне весьці сваю работу на высокім палітычным узроўні.

На гэтыя буйнейшыя недахопы ў разгортваньні рабселькораўскага руху павінна быць завострана ўвага ўсіх партыйных арганізацый, усяго друку БССР і ў першую чаргу газэты «Рабселькор».

Ва ўсёй далейшай рабоце трэба рабіць асноўны ўпор на праверку выкананьня партыйных дырэктыў па пытаньнях рабселькораўскага руху, на поўную рэалізацыю прынятых самаабавязацельстваў.

Конкурс «Правды» на лепшую работу нізавога друку па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў скончыўся. Але гэта ня значыць, што можа быць аслаблена работа нізавога друку ў вёсцы. Наадварот, набыты ў часе конкурсу і асабліва ў часе весенавой сяўбы багацейшы вопыт апэрацыйна-масавай работы павінен быць замацован і памножан на палёх уборкі сацыялістычнага ўраджаю. Бязьлітасны агонь па дэмабілізацыйных настроях, якія дзе-ні-дзе ёсьць! Весьці надалей рашучую барацьбу з недацэнкай ролі рабселькораўскага руху, як з праяўленьнем правага апартунізму ла практыцы.

Фабрычна-заводзкі друк і рабкоры павінны рашуча ўзмацніць сваю ўвагу да барацьбы за прамфінплян трэцяга кварталу і ўсяго чацьвертага, заключнага году пяцігодкі.

Цэнтральнай задачай усяго нашага друку і рабселькораўскага руху зьяўляецца: паказаць узоры барацьбы за ажыцьцяўленьне пастаноў аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, за баявое правядзеньне ўборачнай і збожжазагатоўчай кампаніі, за разгортваньне калгаснага гандлю, за поўнае выкананьне плянаў выпрацоўкі шырпажыву, за ўзмацненьне арганізацыйна-партыйнай, масавай і палітыка-выхаваўчай работы ў горадзе і вёсцы.

Сотнямі і тысячамі канкрэтных бальшавіцкіх спраў у выкананьні паказаных задач, рабселькоры і нізавы друк БССР, уся пралетарская грамадзкасьць павінна адзначыць юбілей кіруючай рабселькораўскай газэты—«Рабселькор».

УШЧЫЛЬНЕНЫЯ ТЭРМІНЫ ЎБОРКІ—АДНА З АСНОЎНЫХ УМОЎ ЗБОРУ ЗБОЖЖА БЯЗ СТРАТ

Раўняцца па Пятрыкову і Камарыну, якія сваячасова скончылі ўборку азімых

ЧОРНАЯ ДОШКА

Мы маем у гэтым годзе ўсе ўмовы, каб атрымаць больш ўраджай збожжавых культур. Гэта будзе залежыць ад правядзеньня ўборачнай кампаніі, якая акрэсьлівае вышкі ўсяго с.-г. году.

ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б у сваіх пастановах аб уборачнай кампаніі падкрэсьліваюць, што «ў цэнтры ўвагі ўсёй работы па ўборцы павінна быць пастаўлена барацьба са стратамі».

Ушчыльненыя тэрміны — адна з асноўных умоў уборкі збожжавых бяз страт. Па БССР для ўборкі азімых вызначана 10 дзён. Паўднёвая зона павінна скончыць уборку жыта да 1 жніўня, цэнтральная — да 5 і паўночная — да 10 жніўня.

Ход уборкі азімых па БССР паказвае, што раёны, якія мы заносім на чорную дошку, не паставілі ў цэнтры сваёй увагі барацьбу са стратамі, не мабілізавалі шырокія масы рабочых, саўгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў на сваячасовую ўборку азімых.

За ганебныя тэмпы ў жніве, за зрыў тэрмінаў уборкі азімых заносяцца на чорную дошку наступныя раёны:

Па паўднёвай зоне:

1. **Кармянскі** — 8,6 проц., 2. **Лельчыцкі** — 13,5 проц., 3. **Гомельскі**—17,9 проц., 4. **Ельскі** — 30,2 проц., 5. **Веткаўскі** — 34,1 проц. (пры 62 проц. па паўднёвай зоне).

Па цэнтральнай зоне:

1. **Касьцюковіцкі** — 3,4 проц., 2. **Дзяржынскі** — 5,9 проц., 3. **Талочынскі** — 9 проц., 4. **Асіпавіцкі** — 9,1 проц., 5. **Прапойскі** — 11 проц. (пры 42 проц. пры цэнтральнай зоне).

Па паўночнай зоне:

1. **Гарадоцкі** — 4,1 проц., 2. **Сеньненскі** — 6,6 проц.

Рад раёнаў, апрача занесеных намі на чорную дошку (**Заслаўскі** — 16,9 проц., **Лагойскі** — 17,5 проц., **Бярэзінскі** — 21,8 проц., **Бягомльскі** — 33,9 проц.), таксама вядуць уборку азімых яўна нездавальняючымі тэмпамі. Гэтыя раёны, як **і ўсе** іншыя, павінны ў бліжэйшую пяціднёўку ліквідаваць адставаньне, зламаўшы супраціўленьне кулацтва і яго агентуры — правых і «левых» апартуністаў — і сапраўды бальшавіцкімі тэмпамі скончыць уборку азімых з мінімальнымі стратамі.

ЗВОДКА НКЗБ

аб ходзе ўборкі азімых па БССР на 1-га жніўня 1932 году

№№ па ч.	НАЗВА РАЁНАЎ	План у гэкт.	Зжата азімых ў проц. да плану	Зьвезена ў проц. да зжатага.
	ПАЎДНЁВАЯ ЗОНА:			
1.	Глускі	16.880	95,4	35,0
2.	Лоеўскі	11.270	93,0	—
3.	Пятрыкоўскі	11.850	100	—
4.	Чачэрскі	13.515	86,8	—
5.	Камарынскі	5.042	100	—
6.	Парыцкі	18.050	83,2	—
7.	Буда-Кашалёўскі	10.800	81,3	0,8
8.	Жлобінскі	22.400	78,3	89,9
9.	Жыткавіцкі	5.610	77,3	—
10.	Тураўскі	3.300	71,6	92,8
11.	Церахаўскі	22.700	69,0	90,7
12.	Мазырскі	24.900	68,2	33,4
13.	Старобінскі	12.340	66,2	—
14.	Брагінскі	14.900	64,0	38,4
15.	Рэчыцкі	23.220	61,6	2,2
16.	Нараўлянск	11.900	61,3	80,7
17.	Рагачоўскі	27.260	59,9	7,0
18.	Уваравіцкі	14.035	58,5	—
19.	Хойніцкі	11.800	58,1	—
20.	Любанскі	11.480	57,1	16,0
21.	Бабруйскі	27.200	47,8	33,0
22.	Веткаўскі	21.000	34,1	—
23.	Ельскі	10.200	30,2	36,8
24.	Гомельскі	9.930	17,9	35,4
25.	Лельчыцкі	9.390	13,5	—
26.	Кармянскі	15.200	8,6	33,1
	Разам па зоне:	**386.172**	**62,0**	**26,9**
	ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗОНА:			
1.	Пухавіцкі	25.231	86,7	—
2.	Чэрвеньскі	20.500	83,3	1,4
3.	Смалявіцкі	16.200	75,4	54,5
4.	Чырвонаслабодзкі	9.400	73,7	67,3
5.	Вузьдзенскі	11.152	73,5	53,6
6.	Менскі	17.389	71,0	18,9
7.	Барысаўскі	18.500	64,8	80,2
8.	Чавускі	25.500	64,7	7,7
9.	Быхаўскі	25.540	64,6	—
10.	Слупкі	22.517	57,5	37,8
11.	Чырвонапольскі	15.550	55,2	—
12.	Магілёўскі	23.564	54,9	65,2
13.	Шклоўскі	24.549	54,7	51,6
14.	Клімавіцкі	16.397	49,1	—
15.	Капыльскі	22.050	47,2	49,3
16.	Чэрыкаўскі	14.800	46,8	70,0
17.	Клічаўскі	16.100	41,5	—
18.	Плешчаніцкі	12.900	41,3	—
19.	Крычаўскі	10.200	37,6	—
20.	Крупскі	21.600	36,0	—
21.	Мсьціслаўскі	23.450	35,1	69,4
22.	Стара-Дароскі	12.100	35,0	95,6
23.	Витомльскі	13.050	33,9	—
24.	Бярэзінскі	19.050	21,8	—
25.	Лагойскі	13.280	17,5	24,6
26.	Заслаўскі	12.400	16,9	2,7
27.	Прапойскі	14.700	11,0	26,4
28.	Асіпавіцкі	11.000	9,1	—
29.	Талочынскі	25.851	9,0	—
30.	Дзяржынскі	12.535	5,9	—
31.	Касьцюковіцкі	30.400	3,4	100,0
32.	Бялынічскі	17.000	—	—
33	Горацкі	26.400	—	—
	Разам па зоне:	**600.855**	**42,0**	**28,2**
	ПАЎНОЧНАЯ ЗОНА:			
1.	Асьвейскі	7.000	78,3	—
2.	Бешанковіцкі	16.500	70,7	10,8
3.	Сіроцінскі	14.000	64,3	—
4.	Віцебскі	10.917	57,6	—
5.	Расонскі	13.750	52,5	—
6.	Чашніцкі	17.050	49,9	—
7.	Сураскі	10.400	48,9	—
8.	Аршанскі	25.908	45,3	—
9.	Лёзьнянскі	15.100	43,4	18,3
10.	Полацкі	27.453	39,6	—
11.	Лепельскі	19.050	37,6	17,4
12.	Вушацкі	16.500	36,9	99,2
13.	Дуброўенскі	15.038	32,7	—
14.	Дрысенскі	15.050	24,2	1,5
15.	Сеньненскі	17.500	6,6	—
16.	Гарадоцкі	27.453	4,1	—
	Разам па зоне:	**262.802**	**40,4**	**9,2**
	Усяго па БССР:	**1.249.832**	**47,8**	**24,3**

Кіраўнік пасеўбюро НКЗБ — ТАРАСЕВІЧ.

Не зацягваць выдачы авансаў калгасьнікам

СЛУЦАК. (Наш кар.).

Час не чакае. Кожны дзень дораг і вымтраецца сотнямі і тысячамі цэнтнэраў збожжа.

Случчына, якая адносіцца да цэнтральнай зоны БССР, павінна закончыць уборку азімых не пазьней 5 жніўня. Тэрмін зусім рэальны. Гэта даказваюць на справе дзесяткі калгасаў Случчыны. На 31 ліпеня па калгасах, што абслугоўваюцца МТС, убрана 90 % азімых. 30 калгасаў МТС скончылі ўборку жыта да тэрміну. Перадавыя калгасы змаглі абмалаціць частку ўраджаю і арганізавалі чырвоныя абозы са збожжам (**«1 мая», «Трактар», «Вольная праца», «Чырвоныя Рэчкі», «Новабелічы»** і інш.). Завяршаюць уборку азімых і рад сельсаветаў, як **В.-Сьліўскі** — 96 проц., **Цараўскі**—85,4 проц.

Адначасова пасьпявае авёс. Калгас **імя К. Маркса**, скончыўшы жніво азімых (150 гэкт.), ужо распачаў уборку раньняга аўса (зжата 12 гэкт.).

На фоне ўдарнай работы перадавікоў яркa вырысоўваецца недапушчальнае адставаньне раёну ў цэлым, таксама, як і некаторых сельсаветаў.

Па раёне на 1 жніўня ўбрана, паводле шпоўных даных райза 64 проц. азімых. Найбольшае адставаньне ў такіх буйнейшых сельсаветах, як **Ленінскі** (38 проц.), **Сарагоўскі** (40 проц.) і **Мусіцкі** (48,5 проц.).

Кіраўніцтва гэтых сельсаветаў не ўсьвядоміла сабе тэй адказнасьці, якая ўскладзена на іх партыяй у гэту ўборачную кампанію. Старшыня Сарагоўскага сельсавету пават ня ведае становішча ўборкі па сваім сельсавеце.

У буйнейшым калгасе раёну **«Чырвоная горка»** (Сарагоўскі сельсавет), дзе трэба ўбраць 400 гэкт. адных азімых і больш 800 гэкт. усіх збожжавых культур, працуюць толькі дзьве жнявяркі. У гэтым, бязумоўна, вінаваты раённыя ўстановы, якія не забясьпечылі калгас машынамі.

На тэмпы ўборкі ў некаторых мясцох уплывае слабасьць масавай работы і зацягваньне выдачы авансаў калгасьнікам.

Выдача авансаў па працадніх адразу ўзьнімае актыўнасьць калгасьнікаў, якія ў мінулым былі пасыўнымі. Яркім прыкладам гэтага зьяўляецца калгас імя К. Маркса. У гэтым калгасе частка збожжа абмалочана, 100 цэнтн. здана дзяржаве, а частка выдана па працадніх калгасьнікам. У выніку калгасьніцы Серада і Карповіч, якія дагэтуль не хадзілі на работу, цяпер, убачыўшы, што хто мае больш працадзён, той больш атрымлівае, пачалі працаваць. Такія факты адзначаны і ў калгасе «1 мая».

Але гэта адзінкі. У большасьці-ж гэта ня робіцца.

Барацьба са стратамі не пастаўлена ў цэнтры ўвагі ўсіх раённых арганізацый і ў першую чаргу райза, МТС і райкалгасаюзу. Загадчык райза тав. **Кахановіч** пават не пацікавіўся, колькі ў раёне прыстасавана зерняўлавіцеляў да жнявярак.

«Сельсаветы не даюць вестак»—вось улюбёны адказ райза.

Па МТС таксама толькі адзінкамі налічваюцца зерняўлавіцелі, хаця ў раёне дзейнасьці МТС працуе калі 100 жнявярак.

Б. Харытончык.

КРЫВАШЧОКАЯ АРЫНА — ударніца калгасу «Перамога», Пухавіцкага раёну

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

За бальшавіцкія тэмпы, за сваячасовае скончэньне ўборкі азімых заносім на чырвоную дошку наступныя раёны:

1. **Пятрыкоўскі** — 100 проц., 2. **Камарынскі** — 100 проц.

КАНДЫДАТЫ НА ЧЫРВОНУЮ ДОШКУ

Заносім у сьпіс кандыдатаў на чырвоную дошку наступныя раёны:

1. **Глускі** — 95,4 проц., 2. **Лоеўскі** — 93 проц., 3. **Чачэрскі**—86,8 проц., 4. **Парыцкі** — 83,2 проц., 5. **Буда-Кашалёўскі** — 81,7 проц., 6. **Жлобінскі** — 78,3 проц., 7. **Жыткавіцкі** — 77,3 проц., 8. **Пухавіцкі** — 86,7 проц., 9. **Чэрвеньскі**—83,3 проц., 10. **Смалявіцкі** — 75,4 проц.

Неаслабляючы тэмпаў жніва, гэтыя раёны ў бліжэйшую пяціднёўку павінны дабіцца 100 проц. выкананьня пляну ўборкі азімых.

Пятрыкоўшчына першай ў БССР скончыла ўборку азімых

ПЯТРЫКОЎ. ПА ТЭЛЕГР.).

Пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, рашуча ліквідуючы меўшыя месца раней перагібы, разгортваючы сацспаборніцтва і ўдарніцтва, ПЯТРЫКОЎСКІ РАЁН 1 ЖНІЎНЯ СКОНЧЫЎ УБОРКУ АЗІМЫХ НА 100 ПРОЦ. Убрана 12008 га. Працягваецца работа па пасьпяховым скончэньні яравых і сенажацяй ва ўстаноўлены партыяй тэрмін.

Сакратар РК КП(б)Б МАНЖАЛЕЙ.

Камарынскі раён скончыў уборку азімых

КАМАРЫНА. (Па тэлеграфу). На аснове дэтальнай распрацоўкі апошніх пастаноў партыі і ўраду аб уборачнай кампаніі, мабілізацыі калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас вакол уборкі, Камарынскі раён поўнасьцю скончыў уборку жыта на плошчы 5.042 га, ячменю ўбрана 764 га (100 проц.), пшаніцы 323 га (100 проц.). Зжата аўса 200 га (18 проц.).

Калгасы **імя Чарвякова, «Рухавік рэвалюцыі», «Інтэрнацыянал», «Чырвоны араты» і «Чырвоны барацьбіт»** заканчваюць жніво аўса.

Сакратар РК КП(б)Б — КАВАЛЁЎ.
Старшыня РВК — ВОЛКАЎ.
Загадчык райза — ГРЫШКЕВІЧ.

Перадавікі ўборачнай

КАПЫЛЬ. (Наш кар.). **Лешненскі** сельсавет па 30 ліпеня скончыў уборку азімых. Перадавыя калгасы **«Чырвоны пагранічнік»** і **«Прагрэс»** скончылі ўборку 25 ліпеня.

Зараз калгасы прыступілі да ўборкі яравых культур.

Гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы правільнай расстаноўцы рабочай сілы і шырока разгорнутым сярод калгасьнікаў сацыялістычным мэтадаў працы. У аснову ўсёй уборкі была пакладзена барацьба са стратамі ўраджаю.

А.

***

ЛЮБАНЬ. Пад кіраўніцтвам партыйнай калгас **«Чырвоная зорка»** першым у раёне скончыў уборку жыта на плошчы ў 42 га. Апрача гэтага на 30 ліпеня калгасам зжата 6 га пшаніцы і 18 га ячменю.

Калгас абмалаціў 200 пудоў жыта. Дзяржаве з першага абмалоту здана 30 пуд., а астатняе размеркавана ў якасьці авансаў паміж калгасьнікамі па працадніх.

Вяроўка Т.

***

ПУХАВІЧЫ. Калгас **«Авангард», Нова-Сеньнаўскага** сельсавету, 28 ліпеня закончыў уборку азімых. Убрана 48 га. Калгас **«Новае Ляцо»** ўборку азімых на плошчы ў 106 га скончыў 30 ліпеня. Убрала азімае і камуна **«Зьвязда».**

Скончыўшы ўборку калгасы і камуна ўзялі на буксір адстаючыя калгасы **«Новы гарадок», «Расьсьвет камунізму»** і **«Асоавіяхім».** Для дапамогі ў апошнія паслана 6 жнявярак і рабочая сіла.

Міхайлаў.

***

КРУПКІ. Калгасы **«Чырвоны барацьбіт»** і **«Дарагавіш», Дубаўскага** сельсавету, скончылі жніво азімых 27 ліпеня.

Новікаў, Мазурын.

Зьнікшыя гэктары...

ЛЕЗНА. (Наш кар.).

«Зьвязда» ўжо сыгналізавала аб тэндэнцыях некаторых раённых арганізацый абвясьціць недасеў жыта. У апошнія дні гэтыя тэндэнцыі прынялі даволі шырокі характар.

Райза мае дзьве лічбы па засеву жыта: першая—па заключнай справаздачы асеньняй сяўбы 1931 году—14.147 гэкт.; другая—па заключнай справаздачы веснавой (?) сяўбы 1932 году—на 1.300 гэкт. менш.

Куды-ж дзелася каля 10 проц. азімага кліну?

Пакуль што дакладнага адказу няма. Пытаньне гэта—«ў стадыі расьсьледваньня», якое, да рэчы, зацягваецца. Канкрэтныя вінаватыя ня выяўлены.

Трэба дадаць, што ў райза надзвычай лёгка сьпісваюцца ў расход дзесяткі і соткі гэктараў «прапаўшага» жыта, апрача вышэйадзначаных 1.300 гэкт., якія бясьсьледна зьніклі.

Складаюцца акты на загінуўшае жыта па кліматычных прычынах. Наколькі яны верны—цяжка сказаць. Такіх актаў набралася ўжо на 903 гэкт. Лічба ня круглая. Загадчык райза тав. **Нэйман**—натура шырокая, таму ён акругляе лічбу і ставіць 1.000 гэкт.

Так «рыхтуюцца» да загатовак асобныя сельсаветы, парт'ячэйкі і лёзьнянскі райзо.

А як з уборкай азімых на мясцох—у калгасах і вёсках? Як змагаюцца са стратамі?

Рад сельсаветаў і калгасаў зацягвае ўборку жыта, якое пачало абсыпацца. Зерняўлавіцелі прымацаваны далёка не да ўсіх машын. Пават па калгасах МТС, дзе працуе 129 жнявярак, прыладжана толькі 59 зерняўлавіцеляў. Па калгасах, якія не абслугоўваюцца МТС, зусім няма зерняўлавіцеляў.

Чаму не да ўсіх машын прыстасаваны зерняўлавіцелі? Іх, напрыклад, няма пры снопавязалках. Дырэктар МТС тав. **Селіванаў** лічыць, што да снопавязалак зерняўлавіцелі непатрэбны. Па яго думцы снопавязалкі працуюць надзвычай акуратна, пават калосьсяў падрабаць ня трэба. На справе-ж гэта няправільна. Асыпаецца жыта і на снопавязалках, застаюцца сям-там і каласкі.

Сьцірташаньне зусім ігнаруецца ў Лёзьнянскім раёне. Лічаць гэта «ня нашай, а паўднёвай справай». Практыка-ж гаворыць зусім аб адваротным.

Напрыклад, калгас **«Бальшавік»**, Чарніцкага сельсавету, 30 ліпеня скончыў уборку жыта. Снапы высахлі. Што-ж робіць калгас? Ён звозіць жыта ў памяшканьні. Гэта ня дрэнна, калі-б хапала памяшканьняў. Але-ж апошніх не хапае. Гэта прымушае зараз-жа пачынаць малацьбу, каб апаражніць памяшканьне для ярыны. І малацьба пачынаецца. Стараецца старая памылка—«канвэер ва што-б та ні стала». А ў гэты час адстае другая работа — уборка ільну і ярыны.

Ня ўсюды арганізавана аховa ўраджаю. У калгасе «Бальшавік» былі выпадкі пакражы жыта. Краў аднаасобнік Шэўнёў. У калгасе «Іскра», паводле вобразнага выразу старшыні калгасу тав. **Шырокага**, нехта «сьвіснуў капёшку сена».

Было-б няправільна, калі не адзначыць рад перадавых калгасаў, якія ўжо скончылі ўборку жыта, касьбу і пачалі масавае перабраньне ільну.

Да такіх калгасаў адносяцца ў першую чаргу **«Перадавік», «Інтэрнацыянал», «Камунар»**, Горбаўскага сельсавету, **«Бальшавік», «Іскра»**, Чарніцкага сельсавету. **«Правда» і імя Варашылава**, Вунаўскага сельсавету і рад іншых.

Такава практыка ўборкі азімых у Лёзьнянішчыне.

САВІЧ АЛЕНА — ударніца калгасу «Перамога», Пухавіцкага раёну

Прывітаньне культпропу ЦК УсеКП(б)—газэце „Рабселькор“

Культпроп ЦК УсеКП(б) шле гарачае прывітаньне рэдакцыі газэты «Рабселькор» — органу Культпропу ЦК КП(б)Б, выданьня «Зьвязды» — у дзень выхаду сотага нумару.

Кожным сваім радком, кожным сваім масавым мерапрыемствам газэта «Рабселькор» павінна дапамагаць партыйнай арганізацыі мабілізаваць раённы, нізавы друк і масы рабселькораў на барацьбу за сваячасовае і высокаякаснае правядзеньне ўборачнай кампаніі, за поўнае выкананьне пляну выпуску тавараў шырокага спажываньня і іх прасоўваньне ў вёску, за бальшавіцкі размах у разгортваньні калгаснага гандлю, за чулыя адносіны да кожнага лісту рабочага, калгасьніка ,бедняка і серадняка—аднаасобніка.

Неабходна настойлівая і пасьлядоўная барацьба за далейшае павышэньне ЯКАСЬЦІ зьместу і апэрацыйна-масавай работы газэты «Рабселькор», за яшчэ большае павышэньне яе актыўнай ролі ў барацьбе на два фронты, за генэральную лінію партыі, за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі, супроць правай—галоўнай—небясьпекі, супроць «левых» загібаў і прымірэнцтва да ўхілаў.

МЫ ЎПЭЎНЕНЫ, ШТО «РАБСЕЛЬКОР», ЯКІ ПАКАЗАЎ РАД ЯРКІХ УЗОРАЎ РАБОТЫ, БУДЗЕ І НА ДАЛЕЙШЫ ЧАС БАЯВОЙ ГАЗЭТАЙ ДЗЕСЯТКАЎ ТЫСЯЧ РАБСЕЛЬКОРАЎ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ.

Культпропу ЦК УсеКП(б) — А. ГУСЕЎ.

„Зьвязда“—„Рабселькору“

Бальшавіцкае прывітаньне калектыўнаму прапагандысту, агітатару і арганізатару—газэце «Рабселькор».

Змагайцеся так за пляны заключнага году пяцігодкі, як змагаецца за іх наша ленінская «Правда». На бальшавіцкіх традыцыях «Правды» загартоўвайце і выхоўвайце шматмільённую армію рабселькораў.

«ЗЬВЯЗДА».

10 ЖНІЎНЯ ЮБІЛЕЙ „ЗЬВЯЗДЫ“

У адзнаку юбілею „Зьвязды“, віцебскія пралетары абяцаюць павысіць тэмпы сваёй работы

Карэннай перабудовай работы дабіцца поўна га выкананьня прам фінпляну

У адзнаку 15-цігадовага юбілею ЦО КП(б)Б «Зьвязды», а таксама ў адказ на адозву фабрыкі **«Прафінтэрн»**, мы, рабочыя, ІТР і служачыя швейнай фабрыкі **«Сьцяг індустрыялізацыі» ўключаемся ў абвешчаны «Зьвяздой» усебеларускі рэйд брыгад друку і агульна-гарадзкое спаборніцтва за пераходны сьцяг гаркому партыі** і бярэм на сябе наступныя абавязкі:

У сувязі з рэарганізацыяй цэхаў разгарнуць шырокую работу па ўцягненьні рабочых у сацспаборніцтва і ўдарніцтва, заключыўшы сацдагаворы паміж цэхамі і брыгадамі. Неадкладна распачаць арганізацыю гаспадарча-разрахунковых брыгад па адпаведных тэхналёгічных працэсах, устанавіўшы сапраўды ўлік эканоміі і эфэктыўнасьці работы кожнай брыгады. Не пазьней 5 жніўня давесьці да кожнай брыгады і варштату прамфінплян 3-га кварталу. Арганізаваць дошкі сацспаборніцтва паміж цэхамі і брыгадамі.

У мэтах рэалізацыі пастаноў ліпеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб разгортваньні калгаснага гандлю і вырабе тавараў шырспажыву, мы абавязваемся ажыцьцявіць поўнасьцю вызначаную нам дадатковую праграму па шырспажыву на 3-ці квартал у суме 235.620 руб., для чаго ўстанаўліваем кантроль за лепшым і рацыянальным скарыстаньнем адкідаў, асабліва ў закройным цэху. Разгарнуць масавую работу ў цэхах і брыгадах па распаўсюджаньні пазыкі рабочых прапаноў па шырспажыву, якая выпушчана газэтай «Віцебскі пралетары».

Усямерна паляпшаць рабочае снабжэньне. **Да 1 лістапада пабудаваць сьвінарнік ня менш як на 300 галоў і павялічыць лік трусоў са 120 шт. да 1.000 шт.** Разам з гэтым узмацніць самазагатоўкі с.-г. прадуктаў.

Поўнасьцю забясьпечыць выхад рабочых фабрыкі на поліва і ўборку ўраджаю ў прыгарадныя гаспадаркі, пасылаючы кожны выходны дзень ня менш 500 чалавек. **Асаблівую ўвагу зьвярнуць на барацьбу са стратамі ў часе ўборкі.**

Лепшы бручны агрэгат тав. Казьлянскага, які заўсёды перавыконвае свае вытворчыя заданьні, у сувязі з юбілеем прысвойвае сабе назву імя «Зьвязды».

Мы абавязваемся павялічыць падпіску на газ. «Зьвязда», ахапіўшы ўсіх камуністаў, камсамольцаў і прафактыў.

Мы, рабочыя адзэй з буйных фабрык на Беларусі, запэўняем ЦО КП(б)Б «Зьвязду», што ўзятыя намі абавязкі на аснове бальшавіцкай перабудовы партыйна-масавай работы і сапраўднага ажыцьцяўленьня 6-ці ўмоў тав. Сталіна будуць з гонарам выкананы.

На даручэньні 4.500 рабочых, ІТР і служачых фабрыкі:

Дырэктар—**Каган.**
Сакратар парткому — **Шыфрын.**
Старшыня фабкому—**Бергер.**
Сакратар калектыву КСМ—**Краўчэнак.**
Рэдкалегія шматтыражкі—**Ліпнік.**
Інжынэр-эканаміст—**Лур'е.**
Рабочыя-ўдарнікі: **Казьлянскі, Салодкіна, Зайцава, Беланожкін, Бэнсман, Генкіна, Абрамзон, Абэзгаўз, Эзрох.**

Выпускаючы с.-г. машыны рашуча змагацца за выраб тавараў шырспажыву

ЦО КП(б)Б «Зьвязьдзе»—**лепшаму змагару за няўхільнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі і ленінскай нацпалітыкі, праваднику бальшавіцкіх ідэй у шырокія масы працоўных—гарачае бальшавіцкае прывітаньне.**

Наш завод «Чырвоны мэталіст», пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пры арганізуючай ролі бальшавіцкага друку, на чале са **«Зьвяздой»** за перамогу ў барацьбе за бальшавіцкія тэмпы работы ў мінуламу атрымаў назву чырвонасьцяжнага. Мы здолелі асвоіць складаныя машыны, ня раз паказвалі свой гераізм у змаганьні за сацыялістычнае будаўніцтва.

Аднак, за апошні час наша работа значна аслабла. Прамфінплян ліпеня за 25 дзён выкананы усяго на 44,7 проц. Карэньні такога адставаньня крыюцца ў слабай рэалізацыі 6-ці ўмоў тав. Сталіна. Абязьлічка ў рабоце і ў доглядзе машын, недахопы ў матар'яльна-бытавым абслугоўваньні рабочых усё яшчэ маюць месца на нашым заводзе.

Падыходзячы да юбілею «Зьвязды», мы ставім перад сабою цэнтральную задачу—поўнасьцю выканаць плян 3-га кварталу, нагнаць прапушчанае, для чаго **ўключаемся ў рэйд ударнікаў друку імя 15-цігодзьдзя «Зьвязды» і агульна-гарадзкое спаборніцтва на заваяваньне ганаровага сьцягу гаркому партыі.**

Канкрэтна мы абавязваемся: **наладзіць работу 42 гаспадарча-разрахунковых брыгад, шляхам узмацненьня пэрсанальнай адказнасьці за іх работу з боку прымацаванага адміністрацыйнага пэрсаналу, штодзённага ўліку эфэктыўнасьці работы.**

У мэтах павялічэньня ўнутры-прамысловага накапленьня строга прытрымліваць цэхавых лімітаў, завесьці дакладны ўлік расходваньня матар'ялаў і ўзаемаразрахункаў паміж цэхамі. Строга сачыць за правільным замацаваньнем людзей за варштатамі.

Узмацніць барацьбу з бракам шляхам сыстэматычнага правядзеньня вытворчых нарад на брыгадах і цэхах.

Неадкладна прыступіць да выпуску ўсіх вызначаных 17 аб'ектаў шырспажыву, сканцэнтраваўшы ўсю работу у адным цэху, поўнасьцю ўкамплектаваўшы апошні рабочай сілай.

У мэтах паляпшэньня рабочага забесьпячэньня мы абавязваемся давесьці да 10 верасьня ўкамплектаваньне трусатніка да 200 шт., сьвінарніка—да 150. Дабіцца пераводу сталоўкі з трэсту грамадзкага харчаваньня ў распараджэньне ЗРК, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на паляпшэньне якасьці абедаў за лік разгортваньня самазагатовак.

Арганізаваць заводу пастаянную дапамогу калгасу на ўборцы гародніны. **Кожны выходны дзень пасылаць на ўборку на менш 120 чалавек. Апрача гэтага вылучыць спэцыяльную брыгаду касцоў.**

Надаючы вялізарнае значэньне «Зьвязьдзе», разгарнуць работу па павялічэньні тыражу, даведзёшы яго па заводу ня менш як да 430 экз.

Наладзіць пастаянную работу па беларусізацыі, арганізаваўшы ў кожным цэху гурткі па вывучэньні беларускай мовы і культуры.

Усе гэтыя самаабавязкі мы будзем выконваць пад лёзунгам лепшага ўдзелу ў рэйдзе і агульна-гарадзкім спаборніцтве за заваяваньне пераходнага сьцягу гаркому партыі.

Няхай жыве ЦК УсеКП(б) на чале з т. Сталіным!

Няхай жыве ЦК КП(б)Б!

Няхай жыве «Зьвязда»—лепшы арганізатар працоўных на выкананьне важнейшых палітычна-гаспадарчых задач!

На даручэньні рабочых заводу:

Дырэктар—**Фрумкін.**
Сакратар парткалектыву—**Каралёў.**
Заўком—**Плавінскі.**
Рэдкалегія «Мэтпромавец»—**Рабкін.**
Рабочыя-ўдарнікі: **Добрамыслаў, Цыркоў, Дрэшчынскі, Зеў, Левін, Гольдбэрг, Мацыёл, Усачэнка.**

Дэпутацкія групы Віцебску выклікаюць на сацспаборніцтва групы Гомелю

Вітаючы лепшага арганізатара працоўных мас на барацьбу за генэральную лінію партыі—ЦО КП(б)Б «Зьвязду» з яе 15-гадовым юбілеем, зьлёт дэпутацкіх груп Віцебскага гарсавету ўключаецца ва ўсебеларускі рэйд друку па адным з галоўных яго пытаньняў—шырспажыву і бярэ на сябе канкрэтныя абавязацельствы.

Кожная дэпутацкая група дабіцца арганізацыі уцільцэху на сваім прадпрыемстве, пераводу яго на гаспадарчы разрахунак і забесьпячэньня абсталяваньнем і рабочай сілай. Разгарнуць шырокую масавую работу па рэалізацыі пазыкі рабочых прапаноў па жырспажыву, устанавіўшы сыстэматычны кантроль за хутчэйшым ажыцьцяўленьнем паступаючых прапаноў рабочых.

Праз цесную сувязь з спажыўцом і работнікамі прылаўку ўстанавіць патрэбны рынку асартымэнт тавараў, арганізаваць кантрольныя пасты па трасоўваньні тавараў да спажыўца, асабліва ў вёску.

Усю работу праводзіць пад лёзунгам: **«Ні аднаго кавалка не утылізаваных адкідаў»**, разгарнуць сацспаборніцтва паміж цэхамі і цэхамі.

На лепшае правядзеньне рэйду выклікаць на сацспаборніцтва дэпутацкія групы Гомельскага гарсавету. Арбітрам спаборніцтва выбраць **ЦО КП(б)Б «Зьвязду».**

На даручэньні зьлёту: **Цукерман, Ніхамзн, Фішман, Роззиблюм, Гутман, Трушчынскі, Бэр, Гудэсман, Чарняк, Дынэр, Сіроцкі, Выдрэвіч, Сіпко, Баранава, Фэгельман, Беленькі, Раманаў, Левінтаў, Раманоўскі, Калінькінаў, Цыкуноў, Лісіцына.**

Важнейшыя задачы па ахове працы

Кастрычніцкая рэвалюцыя стварыла першае ў сьвеце працоўнае заканадаўства. Дыктатура пралетарыяту забясьпечыла поўнае ажыцьцяўленьне ўсіх патрабаваньняў аховы працы, якія ва ўмовах капіталізму зусім неажыцьцявімы. Пасьпяховае разьвіцьцё сацыялістычнага будаўніцтва стварыла моцную матар'яльна-тэхнічную базу санітарна-тэхнічнага дабрабыту сацыялістычных прадпрыемстваў.

Усе гэтыя заваяваньні пралетарыяту атрыманы ім у жорсткай барацьбе з клясавым ворагам, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі. Асабліва важна падкрэсьліць вялікае значэньне пастановы ЦК УсеКП(б) аб рашучай ліквідацыі правааапартуністычнай практыкі старых кіраўніцтваў УсеЦСПС і Наркампрацы СССР з іх трэ'юніяніскімі ўстаноўкамі.

Няма ніякай патрэбы даказваць тыя вялізарныя дасягненьні, якія ёсьць у нашай краіне ў галіне паляпшэньня ўмоў працы на вытворчасьці. Кожны новы завод, цэх, кожнае капітальнае пераабсталяваньне прадпрыемства ёсьць ня толькі посьпех сацыялістычнай індустрыялізацыі, але і санітарна-тэхнічнае паляпшэньне. Ва ўмовах сацыялістычнай рэканструкцыі няма і ня можа быць такога капітальнага будаўніцтва, у якім ня былі-б прадугледжаны ўсе сучасныя навейшыя патрабаваньні гігіены і бясьпечнасьці працы.

У БССР, на тэрыторыі якой да Кастрычніцкай рэвалюцыі было некалькі невялікіх заводаў саматужнага тыпу, дзе кітчнелі сярэднявяковыя ўмовы працы з фэадальна-капіталістычнай эксплёатацыяй рабочых, зараз ёсьць вялізарныя посьпехі ў галіне росту тэхнікі і паляпшэньня ўмоў працы.

Аднак, побач з посьпехамі ў нас ёсьць яшчэ рад буйнейшых недахопаў, адным з якіх зьяўляецца няпоўнае выкарыстаньне матар'яльных сродкаў, што адпускаюцца сацыялістычнай дзяржавай на мерапрыемствы па ахове працы. У 1929 годзе было асыгнавана 600.000 руб., у 1930—700.000 руб., у 1931 — 1.400.000 руб. Сярэдні-ж процант выкарыстаньня іх — 70-80. У 1932 годзе адпушчана паўтары мільёны. Задачай гаспадарчых, прафсаюзных арганізацый і органаў працы зьяўляецца найбольш эфэктыўнае выкарыстаньне гэтых сродкаў па простым прызначэньні. Аднак, магчымасьці далейшага паляпшэньня ўмоў працы далёка ня вычэрпваюцца сродкамі, што адпускаюцца дзяржавай. Вялізарныя магчымасьці ёсьць у сацыялістычнай арганізацыі самой справы, у партыйна-бальшавіцкім не правядзеньні ў жыцьцё, ініцыятыве і энтузіязме будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Якія канкрэтныя задачы ў гэтай галіне? Многія прадстаўляюць, што ахова працы пачынаецца толькі пасьля таго, як рабочыя прыступаюць да працы ў гатовым прадпрыемстве. Гэта ў корані няправільна. Ахова працы пачынаецца разам з плянаваньнем самой вытворчасьці. З гэтага пункту гледжаньня вялізарнае значэньне мае так званы папераджальны санітарна-тэхнічны нагляд за прамысловым капітальным будаўніцтвам. Можна назваць дзесяткі выпадкаў, калі перад самым пускам у эксплёатацыю новапабудаваных прадпрыемстваў аказвалася, што яны пабудаваны са значным адступленьнем ад прынятых праектаў і без прадугледжанага санітарна-тэхнічнага абсталяваньня (запалкавая фабрыка «Пралетарская перамога» і хлебазаводы).

Другім, ня менш важным для аховы ўмоў працы, зьяўляецца пытаньне па абсталяваньні прадпрыемстваў бясьпечнымі мэханізмамі і абяскоджаньня небясьпечных для здароўя вытворчых працэсаў. Разам з правільнай арганізацыяй працы гэта пытаньне мае рашаючае значэньне ў справе барацьбы з няшчаснымі выпадкамі і захворваньнямі на вытворчасьці.

Вельмі дрэнна эксплёатуюцца паляўныя санітарна-тэхнічныя ўстаноўкі і прыстасаваньні па тэхніцы бясьпечнасьці. На любым прадпрыемстве вэнтыляцыйныя і асьвятляльныя ўстаноўкі, якія дорага каштуюць, няўмела, часта тэхнічна няправільна эксплёатуюцца. Наадварот, у радзе прадпрыемстваў даныя ўстаноўкі зусім бязьдзейнічаюць (завод імя Варашылава, імя Домбаля).

Само санітарна-тэхнічнае ўтрыманьне паных прадпрыемстваў мае буйныя недахопы. Мы навучыліся мысьліць аб грандыёзных плянах тэхнічнай рэканструкцыі, капітальных пабудовах і перабудовах, але часамі забываем аб элемэнтарных, прасьцейшых, тэхніных мерапрыемствах, аб санмінімуме на прадпрыемствах.

У гэтым напрамку застаюцца нявыкарыстанымі такія рэзэрвовыя магчымасьці, як сотні грамадзкіх інспэктароў працы, якія па сутнасьці справы павінны ўзначаліць масавы паход па барацьбе за «дробязі» вытворчага быту. На жаль, іх работа ў значнай ступені праходзіць самацёкам, невыстарчальна арганізавана, а галоўнае — без неабходнага кіраўніцтва і інструктажу з боку органаў працы.

Першы ўсебеларускі зьезд па санітарнай тэхніцы і тэхніцы бясьпечнасьці ў сфэры пэрспэктыў і задач другой пяцігодкі павінен распрацаваць практычныя мерапрыемствы па ўсіх гэтых пытаньнях. Зараз трэба мабілізаваць пралетарскую грамадзкасьць на пасьпяховае іх ажыцьцяўленьне.

Дзіхцяр.

„Зьвязду“—у масы

Кампанія па падрыхтоўцы да юбілею «Зьвязды» пачынае разгортвацца па ўсёй рэспубліцы. Шырокія масы рабочых, калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў пачынаюць адгукацца. Аб гэтым гаворыць самазабавязацельствы рабочых раду прадпрыемстваў, чырвоныя абозы з новым ураджаем і г. д.

Адзэй з важнейшых задач кампаніі па падрыхтоўцы да юбілею зьяўляецца павялічэньне тыражу «Зьвязды». Выкананьне гэтай задачы зьяўляецца справай гонару ўсіх партыйных арганізацый Беларусі, бо прэсоўваньне «Зьвязды» ў найшырэйшыя масы працоўных — гэта адзін з магутнейшых сродкаў папырэньня партыйнага ўплыву ў масах.

За апошнія гады тыраж «Зьвязды» значна ўзрос. Гэта сыстэматычнае павялічэньне тыражу зьяўляецца яркім доказам росту палітычнай сьвядомасьці і актыўнасьці мас. Аднак, чам прыходзіцца канстатаваць тую акалічнасьць, што справа арганізацыі падпіскі адстае ад попыту шырокіх працоўных мас на «Зьвязду». Возьмем тры найбольш буйныя пралетарскія і культурныя цэнтры Беларусі — Менск, Віцебск і Гомель.

У **Менску** мы мелі ў студзені 1932 г. 8.018 падпісчыкаў, у лютым—8.335, у сакавіку—8.427, у красавіку—8.110, у маі—7.511, у чэрвені—7.115, у ліпені — 7.103, на жнівень маецца ўсяго 6.231. У памяншэньні — зьніжэньне.

У **Віцебску** мы мелі ў студзені 2.490 падпісчыкаў, у лютым—2.882, у сакавіку—3.028, у красавіку—3.390, у маі—2.826, у чэрвені—2.618, у ліпені—1.924. **У Віцебску, такім чынам, маем рэзкае зьніжэньне.**

У **Гомелі** мы маем у студзені 3.812 падпісчыкаў, у лютым—4.035, у сакавіку — 4.082, у красавіку—3.077, у маі і чэрвені — 3.500, у ліпені — 2.870, на жнівень—2.729 і ў Гомелі ў наяўнасьці зьніжэньне.

Аб чым гавораць гэтыя лічбы? Яны гавораць аб дрэннай рабоце партыйных ячэек вакол распаўсюджаньня «Зьвязды», аб дрэннай рабоце органаў Саюздруку. Выдавецтва «Зьвязды» часта атрымлівае лісты ад рабочых і служачых (партыйных і беспартыйных) Віцебска, Гомеля, Барысава і г. д. аб тым, што часта вельмі цяжка падпісацца або купіць у розьнічнай продажы «Зьвязду». Сотні скаргаў атрымлівае кантора аб дрэннай дастаўцы «Зьвязды» поштай. Вось дзе прычыны некаторага зьніжэньня тыражу «Зьвязды» ў радзе раёнаў Беларусі.

Паглядзім, як у іншых раёнах. У **Рэчыцкім** раёне ў чэрвені было 1.168 падпісчыкаў, у ліпені — 959, на жнівень—846, у **Барысаўскім** у чэрвені — 1.055, у ліпені — 724; у **Магілеўскім** у чэрвені—1.617, у ліпені — 1.061.

Тым, дзе партыйныя арганізацыі ідуць насустрач попыту працоўных мас на «Зьвязду», там, дзе не спадзяюцца на самацёк, там мы маем бесьперапынны рост тыражу.

Возьмем **Бабруйскі** раён. Там у сакавіку было 1.595, у красавіку—1.757, а ў ліпені —1981. У **Аршанскім** раёне ў красавіку—1145, у маі—1309, у чэрвені—1350, а ў ліпені—2.310. У **Пухавіцкім** раёне ў лютым—714, у маі—968, у ліпені — 1004.

У сувязі з юбілеем «Зьвязды» павінна быць ва ўсю шырыню разгорнута работа па павялічэньні колькасьці падпісчыкаў на «Зьвязду». У гэтых адносінах **першыя** крокі зроблены Чырвона-Слабодзкім райкомам, які прыняў па гэтым повадзе канкрэтнае рашэньне. Гэта рашэньне падхопілена Чырвона-Слабодзкім райспажыўсаюзам, які разгортвае ў гэтай галіне работу. Канкрэтныя меры ўжо прыняты Віцебскім гаркомам КП(б)Б. Зусім ясныя самаабавязацельствы макопт падпіскі на «Зьвязду» прыняты рабочымі Віцебскай швейнай фабрыкі і радам іншых прадпрыемстваў.

Ініцыятыву першых павінны падхапіць усе раёны, усе прадпрыемствы Беларусі. Работу па павялічэньні падпіскі на «Зьвязду» нельга весьці ізалявана ад усёй астатняй работы, зьвязанай з падрыхтоўкай да юбілею. Возьмем, да прыкладу, усебеларускі рэйд ударных брыгад друку. Гэты рэйд, калі ўвязаць з ім работу па тыражу «Зьвязды», можа даць і ў гэтых адносінах вялікія рэзультаты. Тое-ж самае і з іншымі формамі масавай работы—сходы, гутаркі, канфэрэнцыі і г. д.

Раённыя фабрычна-заводзкія, саўгасныя і калгасныя газэты павінны на сваіх старонках разгарнуць кампанію па павялічэньні тыражу «Зьвязды». Гэтым патрэбна заняцца неадкладна з тым, каб прыйсьці да юбілею «Зьвязды» з канкрэтнымі рэзультатамі.

РЭЙД РАЗГОРТВАЕЦЦА

ШКЛОЎ. (Наш кар.). РК КП(б)Б, РСІ і рэдакцыя раённай газэты «Прамень камунізму» ўключыліся ва ўсебеларускі рэйд імя 15-цігодзьдзя «Зьвязды».

На бюро райкому вызначаны канкрэтныя мерапрыемствы па правядзеньні рэйду. Рэйд будзе праводзіцца на папяровай фабрыцы «Спартак», па ільназаводзе імя Сталіна, у адным з буйнейшых калгасаў раёну «Барацьба» і трох сельсаветах.

На фабрыцы «Спартак» створана сем ударных брыгад друку, якія ўжо разгарнулі рэйд.

А. Джэлюк, А. Іофэ, Ю. Такарчук

Два юбілеі

Да пятнаццацігодзьдзя „Зьвязды“

III.

Акрэсьліваючы задачы бальшавіцкага друку, Уладзімер Ільліч даў бавую праграму перабудовы газэты. У 1918 годзе ён пісаў: «Тып газэты ў нас не мяняецца яшчэ так, як павінен быў ён мяняцца ў грамадзтве, якое пераходзіць ад капіталізму да сацыялізму». У якасьці баявых задач Ленін высоўваў: «траба будзе дабіцца і мы даб'емся гэтага, што прэса, якая абслугоўвае савецкія масы, будзе аддаваць менш месца пытаньням аб асабістым складзе палітычнага кіраўніцтва, або аб дзеяньнях палітычных мерапрыемствах, якія складаюць звычайную дзейнасьць, руціную работу ўсіх палітычных устаноў. На першае месца прэса павінна будзе ставіць пытаньні працы ў іх непасрэдна практычнай пастаноўцы. Прэса павінна стаць органам працоўнай камуны ў тым сэнсе, каб рабілі гласным якраз тое, што стараліся эхаваць ад масы кіраўнікі капіталістычных прадпрыемстваў».

Выкарыстоўваючы бальшавіцкія традыцыі «Праўды», ідучы па шляху ўказаньняў Уладзімера Ільліча, пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту, «Зьвязда» пасьля гаспнага камунізму прыступіла да ўпартай, кранатлівай барацьбы за ўзьнімцце нашай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, за будаўніцтва нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце культуры.

Было-б сугуба шкрагільным думаць, што працэс перабудовы «Зьвязды» прайшоў у адзін дзень, што рэцэпты гэтай перабудовы былі вынайдзены для ўсіх часоў і ўсіх народаў. У тым і асабліваець нашага друку, што ён не прызнае вечных рэцэптаў, вечных законаў, вечных форм. Задача заключалася ў тым, каб сканцэнтраваць пытаньні на галоўных, рашаючых, вузлавых пунктах, каб знайсьці галоўнае зьвяно ў агульным ланцугу, ухапіўшыся за якое можна было-б выцягнуць увесь ланцуг, увесь комплекс астатніх пытаньняў.

Рашаючым у перабудове зьявілася барацьба за ўзьнімцце прадукцыйнасьці працы, за сацыялістычную дысцыпліну. Уладзімер Ільліч проста ставіў у якасьці асноўнай задачы для нашага друку барацьбу за «прадукцыйнасьць працы — гэта ў канчатковым выніку самае важнае, самае галоўнае для перамогі новага грамадзкага ладу».

У сваіх перадавых артыкулах, у розным роду дакумантах, парысах, фэльетонах «Зьвязда» сыстэматычна змагалася за сьвядомыя адносіны да працы, за ўзьнімцце прадукцыйнасьці працы.

Пераліствоючы камплекты «Зьвязды» за 1920, 21 і 22 гады, ярка кідаюцца ў вочы чатыры асноўныя пытаньні, а іменна: барацьба за чыгуначны транспарт і прамысловасьць, барацьба за апал, за ўздым сельскай гаспадаркі і барацьбы з голадам. Усе гэтыя пытаньні ня былі ізалявана ад агульных задач партыі. Яны цалкам і поўнасьцю вынікалі з тых бальшавіцкіх пастаноў, якія намячаліся партыяй, яны былі на тым этапе вузлавымі праблемамі, ад вырашэньня якіх залежаў далейшы рух наперад.

Цяжка ў газэтным артыкуле перадаць тыя формы работы, якія ўжывалсія «Зьвяздой» у барацьбе за дыктатуру пралетарыяту, за сацыялістычнае будаўніцтва. Вежна адзначыць толькі адно, што ўсе матар'ялы, усе пытаньні, што ўзьніміліся нашай прэсай, білі ў адну мэту — умацаваньне дыктатуры пралетарыяту. А гэта іменна было асновай асноў барацьбы і работы «Зьвязды». Гэта вынікала з простых указаньняў Леніна аб тым, што друк павінен стаць «зброяй сацыялістычнага будаўніцтва».

Пераход да новай эканамічнай палітыкі, як і заўсёды на гістарычных паваротах, выклікаў у пэўнай, менш устойлівай часткі членаў нашай партыі некаторыя хістаньні і сўпраціўленьні. Яны не разумелі таго, што нэп разьлічан на аднаўленьне нашай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, на ўзмацненьне змычкі паміж горадам і вёскай. Яны не разумелі таго, што нэп разьлічан на барацьбу капіталістычных і сацыялістычных элемэнтаў і на перамогу апошніх.

Наша бальшавіцкая прэса, са «Зьвяздой» на чале, адкрывае гураганны агонь па рэнэгатах, паказвае ўсю іх здрадніцкую сутнасьць, мабілізуе і арганізуе шырокія масы працоўных на барацьбу за аднаўленьне прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, на барацьбу за сацыялістычнае будаўніцтва.

Асабліва трэба падкрэсьліць, што «Зьвязда», з нумару ў нумар зьмяшчаючы артыкулы, нэрысы, заметкі аб новай эканамічнай палітыцы, непрымірыма змагалася за ленінізм у тэорыі і на практыцы, была вастрэйшай зброяй у руках партыі ў справе мабілізацыі мас на выразнае правядзеньне генэральнай лініі.

Трэба адзначыць асаблівую ролю тав. Кнорына, які быў ня толькі кіраўніком КП(б)Б, але натхніцелем і непасрэдным удзельнікам у самой «Зьвязьдзе». Тав. Кнорын у сваіх перадавых і іншых артыкулах з уласьцівай яму бальшавіцкай рашучасьцю ставіў пытаньні, выкрываў тых рэнэгатаў, якія імкнуліся проціпаставіць ленінскай лініі сваю яўна апартуністычную лінію.

Труднасьці ў рабоце былі вялізарныя. Не пасаваць перад труднасьцямі, а рашуча іх перамагаць, — вось кіруючы матыў у рабоце «Зьвязды». Пад гэтым кіруючым лёзунгам «Зьвязда» змагалася на розных участках нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Упартай гігацкай работай, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пралетарыят у саюзе з асноўнымі масамі працоўнага сялянства перамог годы інтэрвэнцыі, голад, разруху, аднавіў прамысловасьць і сельскую гаспадарку, будаваў сваю новую сацыялістычную культуру.

Роля друку, і ў першую чаргу «Зьвязды», ва ўсёй гэтай вялікай творчай рабоце — вялізарная.

Посьпехі «Зьвязды» — ёсьць посьпехі ўсёй КП(б)Б.

У папярэдніх артыкулах мы ўжо адзначалі тую барацьбу, якую правяла «Зьвязда» з контр-рэвалюцыйным трацкізмам. У Беларусі, пры наяўнасьці значнага дробнабуржуазнага акружэньня, трацкісцкая апазыцыя пусьціла сва скарэньні даволі глыбока. «Зьвязда» з уласьцівай ёй бальшавіцкай непрымірымасьцю, пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту, выкрывала ўсю контр-рэвалюцыйную сутнасьць трацкісцкіх тэорый, змагалася ў тэорыі і на практыцы за перамогу сацыялізму.

Вялізарныя посьпехі, якія былі атрыманы партыяй на ўсіх фронтах у аднаўленчы пэрыяд, далі магчымасьць перайсьці да разгорнутага наступленьня сацыялізму па ўсім фронце. Гэта паставіла перад «Зьвяздой» задачу рашучай перабудовы сваёй работы ў адпаведнасьці з тымі задачамі, якія высоўваліся гэтым пэрыядам.

Ажыцьцяўляючы плян разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, «партыя перабудавала свае ўласныя рады на баявы лад, пераўзброіла друк, арганізавала барацьбу на два фронты, разграміла рэшткі трацкізму, разьбіла ўшчэнт правых ухілістаў, ізалявала прымірэнцаў, забясьпечыла, такім чынам, адзінства сваіх радоў на базе ленінскай лініі, неабходнае для пасьпяховага наступленьня, і правяла правільнае кіраўніцтва наступленьнем, адзёрнуўшы і паставіўшы на месца, як паступоўцаў з лягеру правых, так і «левых» загібшчыкаў у галіне калгаснага руху» (Сталін).

Партыя разгарнула шырокую самакрытыку, згуртаваўшы ўвагу мас на недахопах нашага будаўніцтва, на недахопах нашых арганізацый і ўстаноў. Іменна ў сыстэме перэўзбраеньня друку самакрытыка зьявілася важнейшым вагаром. Было-б, аднак, няправільным уяўляць, што лёзунг партыі аб разгортваньні самакрытыкі зьявіўся ў нашым друку толькі з 1928 году, што толькі з гэтага моманту (з часу адозвы ЦК УсеКП(б) друк пачаў будаваць сваю работу пад кутом гледжаньня самакрытыкі. Такая пастаноўка пытаньня нічога агульнага з лініяй партыі ня мае. «Самакрытыка ёсьць неадлучная і заўсёды дзейнічаючая зброя бальшавізму, непарыўна зьвязаная з прыродай бальшэвізму, з яго рэвалюцыйным духам» (Сталін).

1. У барацьбе за бальшавіцкую самакрытыку

«Зьвязда», як орган бальшавіцкай партыі, заўсёды была праваднікам самакрытыкі. У пэрыяд дыктатуры пралетарыяту, і асабліва ў пэрыяд разгорнутага наступленьня сацыялізму па ўсім фронце — самакрытыка на гэтым гістарычным этапе набывае выключна важную ролю. Яна зьяўляецца бальшавіцкім мэтадам работы. Вось чаму «Зьвязда», як і ўвесь наш друк, рашуча паставіла пытаньне аб перабудове сваёй работы пад кутом гледжаньня ажыцьцяўленьня пастаноў ЦК аб разгортваньні самакрытыкі.

Можна было-б прывесьці дзесяткі тысяч фактаў, калі на ініцыятыве «Зьвязды» выкрываўся цэлы рад агіднейшых скажэньняў лініі партыі ў паасобных раёнах, установах і інш.

У якасьці прыкладаў прывядзем усім вядомыя гістарычныя факты. Пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту, пры непасрэдным актыўным удзеле шырокіх мас, «Зьвязда» выкрыла цэлы рад скажэньняў клясавай лініі ў апараце Наркамзему, Наркамасьветы, судовых органаў і ў цэлым радзе раёнаў (Віцебск, Барысаў, Тураў і інш.).

Цэнтральны Камітэт партыі выкрыў кулацкую, нацыянал-дэмакратычную сутнасьць прышчэпаўшчыны, якая брала стаўку на разьвіцьцё кулацкіх хутароў у Беларусі. «Зьвязда» па-бальшавіцку разгарнула работу за ліквідацыю ахвосьця прышчэпаўшчыны па ўсіх зьвеньнях.

Памятны тыя факты, калі саюзьнікі Прышчэпава, накшталт Зарэцкіх, расхвальвалі прышчэпаўскія хутары. Яркім прыкладам такой кулацкай прапаганды была кніжка Зарэцкага «Падарожжа на новую зямлю». Нацдэмаўскія «тэарэтыкі», саюзьнікі Кандрацьцева «тэарытычна» ўгрунтоўвалі, што ў Беларусі павінны быць «асобныя шляхі разьвіцьця сельскай гаспадаркі». Толькі выразнае правядзеньне лініі партыі, глыбокая непарыўная сувязь нашага друку з шырокімі працоўнымі масамі, разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі дазволіла «Зьвязьдзе» дапамагчы партыі да канца выкрыць і разьбіць нашчэнт гэтых апалёгетаў капіталізму, агентуру Пілсудзкага — беларускіх нацыянал-дэмакратаў. Ні адна з галін работы не аказалася па-за бальшавіцкай самакрытыкай. Недарма клясавы вораг і яго агентура — правыя і «левыя» апартуністы ўсімі сіламі імкнуліся заціснуць самакрытыку, імкнуліся ўзводзіць нячуваныя паклёпы па «Зьвязду».

«Зьвязда» ня толькі выкрывала недахопы. Яна сваёй апэрацыйнай работай дапамагала партыі зьнішчыць усё, што перашкаджае нашаму руху наперад.

Указаньне правадыра партыі і рэбочай клясы тав. Сталіна аб тым, што наш друк ўсё яшчэ часамі сьлізгае па паверхні., ён яшчэ не навучыўся пераходзіць ад паасобных крытычных заўваг да больш глыбокай крытыкі, а ад глыбокай крытыкі да абагуленьня рэзультатаў крытыкі, да выяўленьня таго, якія дасягненьні зроблены ў галіне нашага будаўніцтва ў рэзультаце крытыкі. Гэта ўказаньне зьяўляецца дырэктывай для друку і для данага этапу сацыялістычнага будаўніцтва. У нашай рабоце быў і ёсьць цэлы рад недахопаў у разгортваньні самакрытыкі. Мы яшчэ і па сёньняшні дзень не заўсёды вывучаем глыбокія прарывы ў выкананьні прамфінпляну, і па цэлым радзе іншых галін. Мы яшчэ часамі сьлізгаем па паверхні. Ня рэдкія выпадкі, калі ўзьнімаем пытаньне і не даводзім яго да канца. Яшчэ слаба змагаемся за абагуленьне рэзультатаў крытыкі, за дзейснасьць яе. Толькі рашучая перабудова работы «Зьвязды» пад кутом гледжаньня рэалізацыі ўказаньняў тав. Сталіна забясьпечыць сапраўдную, бальшавіцкую работу па ўсіх зьвеньнях нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

2. Сіла прыкладу

У пэрыяд дыктатуры пралетарыяту, асабліва ў пэрыяд гігацкага будаўніцтва сацыялізму, асаблівую ролю набывае сіла прыкладу, гласнасьць і сацыялістычнае спаборніцтва. Яшчэ ў 1918 годзе Ўладзімер Ільліч намеціў канкрэтную праграму работы нашага друку. Гэта праграма цалкам і поўнасьцю захоўвае сваю сілу і цяпер. Ленін пісаў: «Няхай у нас будзе ў дзесяць разоў менш газэтнага матар'ялу (магчыма, было-б добра, калі яго будзе ў сто разоў менш), газэтнага матар'ялу, прысьвечанага так званай падзеннасьці, але няхай у нас будзе распаўсюджан у сотнях тысяч і і мільёнах экзэмплярах друк, які знаёміць усё насельніцтва з узорнай пастаноўкай справы ў нямногіх, апераджаючых другія, працоўных камунах дзяржавы. Чорная дошка адсталых фабрык, якія пасьля нацыяналізацыі засталіся ўзорам разброду, распаду, грязі, хуліганства, чужаедзтва, дзе яна? Яе няма. А такія фабрыкі ёсьць. Мы ня ўмеем выкананць свайго абавязку, не вядучы найны супроць гэтых ахоўвальнікаў традыцый капіталізму. Мы не камуністы, а анучнікі, пакуль мы моўчкі церпім такія фабрыкі. Мы ня ўмеем весьці клясавай барацьбы ў газэтах так, як яе вяла буржуазія. Прыпом

УЦІЛЬЦЭХУ—МАКСЫМУМ УВАГІ

Уцільцэх арганізавалі, а рабочымі не забясьпечылі

З 9 ліпеня пачаў працаваць уцільцэх на Менскай швэйнай фабрыцы «Кастрычнік». Ёсьць усе магчымасьці для нармальнай работы данага цэху. Між тым, на справе гэтага няма. Кіраўніцтва фабрыкі не ўзялося яшчэ як сьлед за вырашэньне пытаньня вырабу тавараў шырокага спажываньня. На сёнешні дзень у цэху працуе 80 чал. замест 108 чал. паводле пляну. Камплектаваньне цэху рабочай сілай праходзіць чарапашымі тэмпамі. Сэктар кадраў фабрыкі, замест практычнай работы ў гэтым напрамку, аддзелваецца фармальнасьцю. У сьпісе рабочых для уцільцэху, які быў дан загадчыку цэху сэктарам кадраў, аказаліся «мёртвыя душы».

Работа уцільцэху не арганізавана. Складзены 7 брыгад, якім даручаны пэўныя гатункі вырабу, але яны раскіданы па ўсёй тэрыторыі фабрыкі, што значна ўскладняе кіраўніцтва іх работай. Цэх яшчэ не ўкамплектован адпаведным складам ІТР (тэхкантралёры і інш.). На сёнешні дзень ёсьць толькі адзін загадчык цэху.

На фабрыцы ёсьць усе магчымасьці для таго, каб зьмясьціць уцільцэх у адным памяшканьні, устанавіць канвэерную сыстэму ў вырабе шырспажыву і гэтым самым паскорыць вытворчы працэс. Нэркамлёгпрамам БССР адпушчаны сродкі для абсталяваньня цэху. Аднак, непаваротлівасьць кіраўніцтва фабрыкі тармозіць справу хутэйшага абсталяваньня цэху.

На асартымэнт шырспажыву дагэтуль няма яшчэ тэхнічна-абгрунтаваных расцэнак, пры дапамозе якіх можна было-б увесь вытворчы працэс перавесьці на зьдзельшчыну і гэтым самым узьняць прадукцыйнасьць працы.

Збор адкідаў належным чынам не арганізован. Спэцыяльнага работніка, які-б ведаў зборам адкідаў, сартаваў іх і бесьперабойна забясьпечваў брыгады—на фабрыцы няма. У закройны цэх, дзе згрупавана асноўная маса тэкстыльных адкідаў, дырэкцыя фабрыкі абяцала вылучыць такога чалавека, але абяцаньне засталося абяцаньнем. У выніку частка каштоўных адкідаў зрыбіральшчыцамі фабрыкі выкідваецца вон.

Сярод некаторых рабочых і нават камуністаў ёсьць вельмі пагардлівыя адносіны да уцільцэху. Яго лічаць зборышчам сьмецьця. Парткалектыў і фабком не праводзяць ніякай растлумачальна-масавай работы сярод рабочых, каб вытруціць з коранем такі шкодны погляд.

Усё-ж цэх пэўную працу прарабіў. На 1 жніўня пашыта 250 цёплых дзіцячых коўдраў, 213 канапных падушак, 600 пар чувякоў з суконных акройкаў, 161 маленькіх дываноў, 1.327 жаночых фартухоў. Усяго прадукцыі выпушчана на 19 тыс. руб.

Аднак, усё гэта далёка невыстарчальна супроць таго, што магчыма было зрабіць. Патрабуецца карэнны пералом у палапшэньні работы па шырспажыву, каб забясьпечыць выкананьне пляну ў 140 тыс. руб. на 3 квартал.

Белнезэйабʼяднаньне не дапамагае ф-цы ў вырабе шырспажыву, спусьціла плян і гэтым справа скончылася. Ніякіх указаньняў, не гаворачы ўжо аб канкрэтнай апэрацыйнай дапамозе, абʼяднаньне ф-кі не дае.

Н.

Тав. МЕТТЭ—лепшая ўдарніца уцільцэху менскага дрэваапрацоўчага заводу Імя Молатава

Недаацэньваюць выраб тавараў шырспажыву

(Ліст рабочага)

Выраб прадметаў шырокага спажываньня на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце — закінуты вучастак. Арганізован уцільцэх, які з пачатку работы быў поўнасьцю укамплектован рабочай сілай. Але потым ды рэкцыя камбінату пачала забіраць рабочых на іншыя работы. Цэх дагэтуль ня мае стала абгрунтаванага прамфінпляну.

Апрача уцільцэху тавары шырспажыву вырабляюцца беладрэўным цэхам. Выпускаюцца табурэткі, але вельмі дрэнная якасьць. З выпушчаных за апошні час 2500 табурэтак 1.800 з прычыны дрэннай якасьці нельга дапусьціць да спажыўца.

З боку некаторых адміністрацыйна-тэхнічных работнікаў камбінату ёсьць пагардлівыя адносіны да уцільцэху. Напрыклад, загадчык белцэху тав. **Альштуль** лічыць, што выраб такіх прадметаў, як табурэткі, сталы і інш., зьяўляюцца саматужнымі вырабамі і камбінату зусім не да твару займацца гэтай справай.

Г.

Прамысловая каапэрацыя ў калгасах

Калектыўная апрацоўка зямлі, правільная расстаноўка сіл ствараюць усе ўмовы для разьвіцьця прамысловай каапэрацыі ў калгасах. У справе арганізацыі арцеляй ужо ёсьць некаторае дасягненьне. Аднак, разам з гэтым ёсьць рад недахопаў. Слаба ўцягнуты калгасьныя-прамыславікі ў арцелі. Існуе блытаніна ва ўзаемаадносінах паміж сыстэмай прамысловай каапэрацыі і сыстэмай калгаснай. Слаба пастаўлена работа па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні прамысловых калгасаў.

Экапамічны савет БССР 20 ліпеня вынес пастанову, у якой абавязаў Белкаапрамсаюз разгарнуць масавую работу па арганізацыі ў калгасах прамысловых арцеляй, у першую чаргу такіх, якія вырабляюць рэчы шырокага спажываньня (мэбля, шчоткі, ганчарныя вырабы і г. д.), і промыслаў, якія працуюць на мясцовым недэфіцытным сырцу, адкідах, уцілю, а таксама ўзмацніць забесьпячэньне арцеляй дэфіцытным сырцом (пражай, мануфактурай, мэталем і інш.) за лік сваіх фондаў.

— Камітэту прамысловай каапэрацыі,— гаворыцца ў пастанове,—неабходна распрацаваць праект мерапрыемстваў па вырабу дзяржаўнай прамысловасьцю паўфабрыкатаў для забесьпячэньня калгасных прамысловых арцеляй. Арцелям, якія поўнасьцю выкананць праграму, дазволена ўсю астатнюю прадукцыю, выробленую з нецэнтралізаванага сырцу зьвыш пляну, прадаваць на калгасным рынку.

Для стварэньня зацікаўленасьці калгасаў у разгортваньні дзейнасьці прамысловых арцеляй у калгасах, Эканомсавет абавязаў усе прамысловыя арцелі вылучыць са сваіх гадавых прыбыткаў пэўны процант на культурна-бытавое абслугоўваньне калгаснікаў. Пры ўмове выкананьня праграмы вылучаць ад 3 да 7 проц. чыстага прыбытку на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Наркамзему, Белкалгасцэнтру і раённым выканаўчым камітэтам прапанавана аказаць максымальную дапамогу ў справе арганізацыі прамысловых арцеляй у калгасах.

Белкаапсаюз абавязан падаць у Экапамічны савет кантрольныя лічбы з заключэньнем Дзяржпляну на пабудову прамысловых арцеляй у калгасах у другім паўгодзьдзі 1932 г.

Калгасныя прадпрыемствы будуюцца выключна на сродкі калгасаў. Яны арганізуюцца калгасамі ў форме спэцыяльных калгасных мерапрыемстваў. Экапамічны савет даручыў Дзяржпляну разам з Белкалгасцэнтрам і Белкаапрамсаюзам распрацаваць правілы, якія рэгулявалі-б работу гэтых прадпрыемстваў.

Промыслы, якія абслугоўваюць толькі ўнутраныя патрэбы калгасаў (кузьні і іншыя рамонтныя майстэрні), як правіла, арганізуюцца непасрэдна калгасамі, як іх спэцыяльныя прадпрыемствы.

Белкаапрамсаюзу і Калгасцэнтру даручана ў двухдэкадны тэрмін распрацаваць практычныя мерапрыемствы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні прамысловых калгасаў, правільнай расстаноўцы рабочай сілы на промысьле і сельскай гаспадарцы, рэгуляваньні аплаты працы на аснове цьвёрдай грашовай формы, а таксама заключыць генэральны дагавор аб работе прамысловай арцелі.

Рабочыя, якія заняты ў калгасах на промыслах, павінны быць пераведзены на простую ці прагрэсыўна - прэміяльную зьдзельшчыну. Праца рабочага, занятага на промыслах, ацэньваецца ня толькі па колькасных паказальніках, але і па якасьці.

Белкаапрамсаюзу прапанавана арганізаваць самаправерку сацыяльнага складу прамысловых калгасаў з мэтай ачысткі іх ад кулацка-заможных элемэнтаў, узьняць на належную вышыню палітыка-выхаваўчую і культурна-асьветную работу сярод калгаснікаў, якія працуюць у прамысловых калгасах.

Для забесьпячэньня актыўнага ўдзелу Белкаапрамсаюзу і яго арганізацый на мясцох у плянаваньні сельскай гаспадаркі прамысловых калгасаў, прапанавана Народнаму камісарыяту зямляробства і Народнаму камісарыяту працы ў месячны тэрмін перадаць у распараджэньне Белкаапрамсаюзу аднаго агранома, а пры чарговых выпусках агранамаў улічыць патрэбы прамысловай каапэрацыі ў агранамічных кадрах.

Збожжазагатоўкам—тэхнічную і складзкую базу

Да збожжазагатоўчай кампаніі засталіся лічаныя дні. Перадавыя калгасы, вёскі арганізуюць масавыя чырвоныя абозы са збожжам новага ўраджаю. З кожным днём узмацняецца падвоз да загатоўчых пунктаў.

Між тым, **збожжазагатоўчыя арганізацыі БССР яшчэ не падрыхтаваліся, элеватары, склады ня прыведзены ў парадак, не загатоўлена тара.**

Ня гледзячы на скончэньне тэрмінаў, праверка і ўдасканаленьне **кантрактацыйных дагавораў** ва многіх раёнах яшчэ ня скончана. Праверка паказала, што **якасьць** заключаных дагавораў у радзе раёнаў нездавальняючая. Дагавары былі заключаны мэханічна, бяз шырокага абгаварэньня на сходах калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў. У выніку, напрыклад, у Касьцюковіцкім раёне былі заключаны дагавары на 17.067 га, фактычна-ж закантрактавана толькі 13.725 га, у Любаньскім раёне адпаведна — 5.860 га і 2.428 га і г. д.

Некаторыя раённыя партыйныя і савецкія арганізацыі (Клімавічы, Віцебск) недаацэнілі значэньня праверкі кантрактацыйных дагавораў, як важнейшай умовы правільнай арганізацыі збожжазагатовак і не аказалі загаткантарам патрэбнай дапамогі.

Яшчэ да гэтага часу складачныя памяшканьні не абсталяваны. Ва многіх раёнах не хапае збожжахавальнікаў. Так, загатоўчы пункт Горацкага раёну забясьпечан складамі толькі на 400 тон пры патрэбе ў 2.000 тон. У Слуцкім раёне можна зьмясьціць 1.000 тон, а трэба 3.500 тон. У Магілеве 2.000 тон збожжа не забясьпечаны складзкімі памяшканьнямі.

Да гэтага трэба дадаць надзвычай марудныя тэмпы рамонту наяўных складаў. Плян рамонту выкананы усяго на 43 проц. Адказны па тарна-складзкой групе Белзагатэбожжа тав. **Стрыжэўскі** гаворыць: «Да рамонту Слуцкага элеватара толькі прыступлена, але няма надзеі на яго скончэньне, бо не хапае матар'ялаў». Што-ж зроблена загатоўчымі арганізацыямі для вышукваньня і мабілізацыі мясцовых рэсурсаў будматар'ялаў? На гэта тав. **Стрыжэўскі** ня можа даць адказу. Надыходзіць збожжазагатоўчая кампанія, а работнікі Белзагатэбожжа благадушнічаюць.

Няма баявых тэмпаў у мабілізацыі тары. Калі нават улічыць, што 50 проц. збожжа будзе перавезена бестарным парадкам, то недахоп у тары вызначыцца ў 80.000 мяхоў. Брэзэнтаў замест 200 ёсьць толькі 34.

Загатканторы, акрамя Віцебскай, не арганізавалі рамонту тары. Дэзынфэкцыя складаў праведзена ўсяго на 40 проц.

Зразумела, што такая «работа» Белзагатэбожжа і яго зьвеньняў на мясцох не забясьпечвае пасыпяховага правядзеньня збожжазагатоўчай кампаніі. **Неабходна ў максымальна-кароткі тэрмін скончыць падрыхтоўку тэхнічнай і складзкой базы, фарсаваць рамонт і дзэзынфэкцыю.**

Вакол збожжазагатовак павінна быць разгорнута самая шырокая масавая работа сярод калгаснікаў і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў.

Посьпех збожжазагатовак будзе залежыць ад таго, як хутка партыйныя арганізацыі раёнаў мабілізуюцца навокал гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі. Толькі правільнай арганізацыяй работы, канкрэтным апэрацыйным кіраўніцтвам і рашучым перамаганьнем апартуністычнай стаўкі на самацёк можна будзе поўнасьцю і ў тэрмін выканаць плян збожжазагатовак і забясьпечыць далейшае разгортваньне калгаснага гандлю.

Дашкевіч.

Адрамантаваць склады, загатовіць тару і брэзэнты

ГОМЕЛЬ.

Міжраённая кантора Заготзбожжа абслугоўвае 5 раёнаў. З гэтых раёнаў толькі 2 —**Гомельскі і Уваравіцкі**—гатовы да прыёмкі новага збожжа. Ва Уваравіцкім р-не пабудован новы склад, які прадэзынфектаваны, укамплектаваны апарат. Гомель забясьпечан складамі поўнасьцю. У гэтым годзе вызначан прыёмачны пункт пры дзяржаўным мэльне, але дрэнна яшчэ стаіць справа з дэзынфэкцыяй складзкіх памяшканьняў і скончэньнем іх рамонту.

Зусім іншы малюнак у 3-х астатніх пунктах. Буйнейшы з іх—**Цсрахаўскі**—забясьпечан складамі толькі на 200 тон, у той час, калі павінна быць загатоўлена збожжа звыш 1.000 тон. Тлумачыцца гэта тым, што адзін склад, які належыць Заготзбожжа, вясной быў перадан у часовае карыстаньне Насенканторы, а другі Белсельснабу. Ня гледзячы на прапановы мясцовых арганізацый, Насенкантора і Белсельснаб упарта не апаражняюць склады Заготзбожжа. Не падрыхтаваны Веткаўскі і Чачэрскі загатоўчыя пункты, дзе складачныя памяшканьні таксама зьяўляюцца «вузкім месцам».

Нездавальняюча праходзіць загатоўка і рамонт тары. Не хапае мяхоў і брэзэнтаў. Аднак міжраённая кантора Заготзбожжа ня прымае рашучых захадаў да ліквідацыі недахвату тары.

Да гэтага часу Заготзбожжа і транспартныя арганізацыі не абгаварылі пытаньня аб арганізацыі бястарных перавозак.Асабліва праяўляе бяздзейнасьць аўтатранспарт. Па цікавяцца бястарнымі перавозкамі МТС і райкалгассаюз. Агранам МТС тав. **Взсман** лічыць, што «паогул ва ўмовах Беларусі немэтазгодна арганізоўваць бястарныя перавозкі».

Вазавых баз кантора Заготзбожжа не мае. Адсутнічаюць таксама неабходныя лябараторныя прылады.

Перад гомельскімі арганізацыямі стаіць баявая задача—**безадкладна пераключыцца на падрыхтоўку да збожжазагатоўчай кампаніі і ў першую чаргу адрамантаваць і прывесьці ў парадак склады і тару.**

Ч. ГАСМАН.

Шырэй падрыхтоўку да новага навучальнага

ГАЛАВАЦЯПЫ НА СТ. КРЫЧАЎ

Да пачатку навучальнага году засталося зусім нямнога часу. Гэты час трэба скарыстаць для сапраўднай бальшавіцкай падрыхтоўкі. Але асобныя загадчыкі школ **Крычаўскага** раёну разам з райана апартуністычна разважаючы лічаць, што зараз яшчэ... рана рыхтавацца да новага навучальнага году і **аніякай работы не вядуць.**

Чыгуначная ФЗС засталася зусім бяспрытульнай. Мінулы год быў для яе годам пакут; яе па загаду прараба Цурыкава ганялі з памяшканьня ў памяшканьне, выкідваючы ўсю маемасьць на вуліцу. На Цурыкава справа перадана пракурору. Крычаўскага раёну **ў сьнежні месяцы** мінулага году і да гэтага часу прараб да адказнасьці ня прыцягнут.

Крычаўскі чыгуначны вузел з кожным годам пашыраецца. Ужо зараз на вузьле працуе больш 1200 чал. З 1-га верасьня ўступае ў эксплёатацыю дэпо і майстэрні. Колькасьць рабочых павялічыцца, узрасьце і армія дзяцей школьнага ўзросту. Мы ўжо зараз маем вялікія перашкоды з прычыны адсутнасьці памяшканьняў для школы. Машыністы, іх памочнікі і інш. катэгорыі рабочых адмаўляюцца ехаць у Крычаў на работу з-за адсутнасьці школы.

Ні райком партыі, ні райвыканком, ні Ўнецкі райпрафсаюз не падумалі аб тым, каб на Крычаўскім вузьле была школа.

Яны па-апартуністычнаму разважаючы, кажуць: **«Школу павінны пабудаваць чыгуначныя арганізацыі»**, а чыгуначныя кажуць, што **«ФЗС павінны будаваць райвыканкомы».**

Гэтыя разважаньні цягнуцца больш году. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі вузла таксама палец аб палец не ўдарылі ў справе стварэньня добрых умоў для работы школы. Вось факты, як яны ёсьць. Загадчык камунальнай гаспадаркай вузла **Кіргет**, яго памочнік **Шарко** і загадчык клюбу **Кліжавіцкі**, як шчадрынскія «глупавы», як і ў мінулым годзе, **выкінулі ўсю школьную маемасьць на вуліцу з памяшканьняў занятых школай.** Гэта маемасьць паламана і зараз канчаткова псуецца пад дажджом. **Аслабанёны-ж дом абсталёўваецца пад кацыярыю Кіргета.**

Другое памяшканьне адабрана пад кантору МТС і трэцяе—кагасное перакідваецца кілёмэтры за 4 ад станцыі.

Мы патрабуем, каб у гэту справу неадкладна ўмяшалася РСІ і прыцягнула вінаватых да адказнасьці. Адначасова адпаведным арганізацыям чыгункі і Крычаўскага раёну зараз-жа трэба знайсьці памяшканьне для чыгуначнай ФЗС і разгарнуць бальшавіцкую падрыхтоўку да новага навучальнага году, бо ад добрай падрыхтоўкі і залежыць якасьць вучобы.

Брыгада:

Рубзка, Малахаў, Іванскі.

Чырвоныя абозы са збожжам новага ўраджаю

ЧАЧЭРСК. (Па тэлеграфу).

На ініцыятыве рэдакцыі райгазэты і селькораўскага актыву перадавымі калгасамі—«Адзінства», «Камуна» і «Леніна» арганізаваны чырвоныя абозы, якімі здана дзяржаве 23.5 тон збожжа.

Адказны рэдактар—**Адзінец.**

Селькоры: **Марон, Рыўкін і Мэлер.**

***

ПЯТРЫКОЎ. (Па тэлеграфу).

Перадавымі калгасамі раёну здана чырвонымі абозамі 10 цэнтн. жыта.

Райса—**Чэрсонік.**

Райкалгассаюз — **Булава.**

***

МАГІЛЕЎ. (Па тэлеграфу).

Калгасамі «Колас», імя XVI зьезду і «Драджэньне», Гарадзішчанскага сельсавету, чырвоным абозам здана 46 цэнтн. жыта новага ўраджаю.

Загатзбожжа — **Жэйман.**

Райкалгассаюз — **Камедаў.**

***

ЦЕРАХАЎКА.

1 жніўня калгас імя Будзёнлага, Кузьміцкага сельсавету, арганізаваў чырвоны абоз, якім здана 2.070 кілё ячменю, 2.500 кілё памідораў і 8 вазоў гуркоў (БелТА).

ПЛЕШЧАНІЦЫ. (Па тэлеграфу).

У адзнаку міжнароднага антываеннага дня перадавымі калгасамі Плешчаніцкага раёну чырвоным абозам здана 3.160 кілёграм збожжа. На 9 жніўня падрыхтоўваецца агульна-раённы чырвоны абоз.

РВК — **Лук'янчык.**

РК — **Быбчынскі.**

Райзагатэбожжа — **Ліпец.**

***

РАГАЧОЎ.

31 ліпеня калгасамі Рагачоўскай МТС здача чырвоным абозам 13.315 кілё збожжа новага ўраджаю. (БелТА).

інтарэсы рабочай клясы ад тых жменяк, груп, пластоў рабочых, якія ўпарта трымаюцца традыцый, звычак капіталізму і ўсё яшчэ глядзяць на савецкую дзяржаву парапешкуму: даць «ёй» работы паменш і пагоршы, — садраць з «яе» грошай побольш».

На шляху ажыцьцяўленьня гэтага ўказаньня Леніна мы дабіліся вельмі многага. Але к было-б няправільна думаць, што мы ўжо поўнасьцю ажыцьцявілі гэта надзвычай важнае, канкрэтнае і баявое ўказаньне Ўладзімера Ільліча. Ленін патрабаваў таго, каб доўк штодзеннымі настойвальнымі дабіваўся ператварэньня паасобных вучасткаў нашага будаўніцтва ва ўзорныя, рэклямаваў-бы іх.

Барацьба за разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, за выкананьне ўсіх нашых плянаў, за выразнае і пяўхільнае правядзеньне лініі партыі нямысьлімa без рэалізацыі гэтых указаньняў Леніна нашым друкам.

«Зьвязда» правяла вялізарную работу па паказу ленінных прадпрыемстваў па разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Са шмат іншых момантаў непасрэдная апэрацыйная работы «Зьвязды» т. зба адзначыць праведзеную «Зьвяздой» барацьбу за прамфінплян на буйнейшых прадпрыемствах Беларусі (Гомсельмаш, Бабруйскі камбінат, фабрыка «Дзяцро», «Чырвоны мэталіст», завод імя Дамбаля, добрушская фабрыка і г. д.).

У барацьбе за прамфінплян, за выкананьне лёзунгу «Пяцігодка за чатыры гады», «Зьвязда» ня толькі змагалася за перабудову работы на прадпрыемствах, у саўгасах, калгасах і ўстановах. Яна разам з тым перабудоўвала і самую сябе. На старонках газэты замест аддзелаў «Рабочае жыцьцё», «Партыйнае жыцьцё» і г. д. зьяўляюцца апэрацыйныя, тэматычныя падборкі, апэрацыйныя зводкі, узмацняецца непасрэдна жывая сувязь з прадпрыемствамі, рабкорамі і г. д.

Вялізарнейшае, выключна важнае значэньне атрымалі чорная і чырвоная дошкі. Яны зьявіліся простым выкананьнем указаньняў Ўладзімера Ільліча.

Ленінская пастаноўка пытаньня на старонках газэты аб сіле прыкладу давала і дае надзвычай вялізарныя, ня толькі практычныя, але і палітычныя рэзультаты. Паказ ленінага мабілізуе і арганізуе масы, заражае іх энтузіязмам, перадае вопыт перадавых. Грамадзкая дапамога ў выглядзе буксіру, разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва — вось тыя формы камуністычнай працы, якія прапагандаваліся «Зьвяздой» на сваіх старонках.

Ленін ня раз пісаў, што «пры дыктатуры пралетарыяту сіла прыкладу атрымлівае ўпярэдняю сваё масавае распаўсюджаньне». І на самой справе, калі пры капіталізьме ў сілу канкурэнцыі кожнае прадпрыемства зьяўлялася «няпрыступнай цытадэллю» у сэнсе перадачы вопыту, дык пры сацыялістычнай вытворчасьці сіла прыкладу ў першыню атрымлівае сваё шырокае, масавае дастасаваньне. Прывядзем некалькі характэрных прыкладаў. На заводзе Гомсельмаш глыбокі прарыў. Прамфінплян ня выконваецца. Пры дапамозе ЦК КП(б)Б і пад яго кіраўніцтвам «Зьвязда» разгортвае вялізарную работу ў барацьбе за прамфінплян. Галоўны ўпор — на рэалізацыю пастаноў партыі, на разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Ня крыкам, не паскокамі, а глыбокай работай у брыгадах, цэхах з паасобнымі ўдарнікамі, паказам ленінага, выкараненьнем горшага, мабілізацыяй мас «Зьвязда» разам з заводзкімі партыйнымі арганізацыямі выводзіць завод з паласы прарыву. Лопнулі, як мыльны пузыр, заявы апартуністаў з заводзкага кіраўніцтва, што плян нерэальны, нічога на выйдзе і г. д. «Зьвязда» не абмежавалася тым, што правяла вялікую работу на заводзе Гомсельмаш. На сваіх старонках яна паказвае тыя формы і мэтады работы, якія ўжываліся заводам для ліквідацыі прарыву. Гэты вопыт пераносіцца на дзесяткі другіх прадпрыемстваў, разгортваецца сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж прадпрыемствамі, арганізуецца грамадзкі буксір і ў рэзультаце рад перадавых прадпрыемстваў выконвае прамфінплян.

З гэтага аднаго факту ня цяжка пераканацца, наколькі вялікае арганізуючае значэньне мае сіла прыкладу. Сіла прыкладу мае асаблівае значэньне і зараз. Тав. Сталін на парадзе гаспадарнікаў гаварыў, што «было-б значна лепш, калі-б нашы гаспадарнікі, кіраўнікі, замест таго, каб займацца прамовамі і запэўненьнямі, заселі-б на месяц-другі, скажам, на капальні, або заводзе, вывучылі-б усе дэталі і «дробязі» арганізацыі працы, зьнішчылі-б там на справе абязьлічку і потым распаўсюдзілі-б опыт дзнага прадпрыемства на другія прадпрыемствы». Гэта ўказаньне павінна стаць баявой праграмай работы для нашага друку.

У барацьбе за выкананьне плянаў чацьвертага, заключнага году пяцігодкі «Зьвязда» мае вялізарнае значэньне. Аднак, не ўсе рабочыя ведаюць, што «пры дыктатуры пралетарыяту сіла прыкладу атрымлівае ўпярэдняю сваё масавае распаўсюджаньне». І на самой справе, калі пры капіталізьме ў сілу канкурэнцыі кожнае прадпрыемства зьяўлялася «няпрыступнай цытадэллю» у сэнсе перадачы вопыту, дык пры сацыялістычнай вытворчасьці сіла прыкладу ў першыню атрымлівае сваё шырокае, масавае дастасаваньне. Прывядзем некалькі характэрных прыкладаў. На заводзе Гомсельмаш глыбокі прарыў. Прамфінплян ня выконваецца. Пры дапамозе ЦК КП(б)Б і пад яго кіраўніцтвам «Зьвязда» разгортвае вялізарную работу ў барацьбе за прамфінплян. Галоўны ўпор — на рэалізацыю пастаноў партыі, на разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Ня крыкам, не паскокамі, а глыбокай работай у брыгадах, цэхах з паасобнымі ўдарнікамі, паказам ленінага, выкараненьнем горшага, мабілізацыяй мас «Зьвязда» разам з заводзкімі партыйнымі арганізацыямі выводзіць завод з паласы прарыву. Лопнулі, як мыльны пузыр, заявы апартуністаў з заводзкага кіраўніцтва, што плян нерэальны, нічога на выйдзе і г. д. «Зьвязда» не абмежавалася тым, што правяла вялікую работу на заводзе Гомсельмаш. На сваіх старонках яна паказвае тыя формы і мэтады работы, якія ўжываліся заводам для ліквідацыі прарыву. Гэты вопыт пераносіцца на дзесяткі другіх прадпрыемстваў, разгортваецца сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж прадпрыемствамі, арганізуецца грамадзкі буксір і ў рэзультаце рад перадавых прадпрыемстваў выконвае прамфінплян.

Ленін ня раз пісаў, што «пры дыктатуры пралетарыяту сіла прыкладу атрымлівае ўпярэдняю сваё масавае распаўсюджаньне». І на самой справе, калі пры капіталізьме ў сілу канкурэнцыі кожнае прадпрыемства зьяўлялася «няпрыступнай цытадэллю» у сэнсе перадачы вопыту, дык пры сацыялістычнай вытворчасьці сіла прыкладу ў першыню атрымлівае сваё шырокае, масавае дастасаваньне. Прывядзем некалькі характэрных прыкладаў. На заводзе Гомсельмаш глыбокі прарыў. Прамфінплян ня выконваецца. Пры дапамозе ЦК КП(б)Б і пад яго кіраўніцтвам «Зьвязда» разгортвае вялізарную работу ў барацьбе за прамфінплян. Галоўны ўпор — на рэалізацыю пастаноў партыі, на разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Ня крыкам, не паскокамі, а глыбокай работай у брыгадах, цэхах з паасобнымі ўдарнікамі, паказам ленінага, выкараненьнем горшага, мабілізацыяй мас «Зьвязда» разам з заводзкімі партыйнымі арганізацыямі выводзіць завод з паласы прарыву. Лопнулі, як мыльны пузыр, заявы апартуністаў з заводзкага кіраўніцтва, што плян нерэальны, нічога на выйдзе і г. д. «Зьвязда» не абмежавалася тым, што правяла вялікую работу на заводзе Гомсельмаш. На сваіх старонках яна паказвае тыя формы і мэтады работы, якія ўжываліся заводам для ліквідацыі прарыву. Гэты вопыт пераносіцца на дзесяткі другіх прадпрыемстваў, разгортваецца сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж прадпрыемствамі, арганізуецца грамадзкі буксір і ў рэзультаце рад перадавых прадпрыемстваў выконвае прамфінплян.

«Правды» гэтыя памылкі былі рашуча выпраўлены.

У барацьбе за трэцюю бальшавіцкую сяўбу «Зьвязда» правяла вялізарную работу. Пад выпрабаваным бальшавіцкім кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, на чале з тав. Гікало, «Зьвязда» паказала баявыя ўзоры работы. Па ініцыятыве газэты была праведзена вялікая работа ў Крычаўскім раёне. Ліст калгаснікаў Бацьвінаўскага сельсавету паслужыў вялізарным стымулам у барацьбе за падрыхтоўку выхаду ў поле ўсімі калгасамі Беларусі. «Зьвязда» апэрацыйна, з дня ў дзень змагалася за выкананьне пляну сяўбы. Вялізарнейшая падрыхтоўчая работа, праведзеная ўсёй КП(б)Б, выразнасьць і апэрацыйнасьць кіраўніцтва, непасрэдная дапамога мясцом з боку ЦК у часе веснавой сяўбы — забясьпечылі поўны посьпех у выкананьні пляну сяўбы.

Чорная і чырвоная дошкі былі магутным фактарам прапаганды, агітацыі і арганізацыі мас у барацьбе за бальшавіцкую сяўбу.

3. На аванпастох сацыялістычнай будоўлі

У жорсткай барацьбе з клясавым ворагам і яго агентурай — правымі і «левымі» апартуністамі — у выніку бальшавіцкай сяўбы Савецкая Беларусь», як і ўвесь Савецкі саюз, канчаткова ўмацаваліся на новым сацыялістычным шляху. Сацыялізм атрымаў рашаючыя перамогі. Вастрэйшая зброя нашай партыі — друк — у барацьбе за трэцюю бальшавіцкую вясну быў у першых радох.

Шэсьць гістарычных умоў т. Сталіна і лёзунг аб аўладаньні тэхнікай у штодзеннай рабоце нашага друку — зьяўляюцца адпраўнымі пунктамі. Без барацьбы за 6 умоў тав. Сталіна, за аўладаньне тэхнікай немагчыма перабудова нашага друку. Апошнія пастановы партыі аб мяса і збожжазагатоўках, аб разгортваньні савецкага і калгаснага гандлю, аб вырабе тавараў шырокага спажываньня ставяць перад нашым друкам задачы далейшай перабудовы ў напрамку рэалізацыі пастаноў партыі. Толькі выразнае правядзеньне ў жыцьцё дырэктыў партыі, непрымірымая барацьба з усякага роду скажэньнямі клясавай лініі — забясьпечаць друку сапраўдную перабудову.

На бальшавіцкіх традыцыях «Зьвязды» вучыцца, расьце і выхоўваецца ўвесь друк Савецкай Беларусі. «Зьвязда» сваімі аглядамі газэт, непасрэднай практычнай дапамогай, апэрацыйным кіраўніцтвам запамагае раённаму і цэнтральнаму друку ў яго барацьбе за ажыцьцяўленьне задач партыі.

Наш друк за апошні час значна ўзрос. Гэта вынікае з усёй палітыкі нашай партыі. Бо толькі захопам пралетарыятам улады ў свае рукі адкрываюцца нячуваныя магчымасьці для росту і разьвіцьця друку рабочай клясы. Ўладзімер Ільліч пісаў: «Бальшавікі ганарацца тым, што далі ўпярэдняю свабоду друку ад капіталістаў, што яны ў першы раз у вялізарнай краіне стварылі друк, які не залежыць ад жменькі багатыроў і міліянэраў; друк, які далкам прысьвечан задачам барацьбы супроць капіталу».

Дыктатура пралетарыяту дала ўсе магчымасьці да таго, каб наш друк разьвіваўся шпаркімі тэмпамі. Тав. Сталін у заключным слове на XII зьезьдзе партыі гаварыў: «Друк павінен расьці не па днях, а па гадзінах, — гэта самая вострая і самая моцная зброя нашай партыі». Апошні пэрыяд з усёй відавочнасьцю паказвае, што ўказаньні т. Сталіна ажыцьцяўляюцца.

Вось некаторыя даныя росту нашага друку:

У 1919 годзе агульны тыраж выданьняў за 4 м-цы па Беларусі складаў:

«Зьвязда» 1.100.000 экз.

«Бедняк» 900.000 экз.

«Дэр Штэрн» 40.000 экз.

«Подкольная Правда» 10.000 экз.

«Дэр Ротэ Зольдат» 100.000 экз.

У дзень распаўсюджвалася 21.500 экз., а ўсяго за чатыры месяцы — 2.250.000 экз.

Даволі ўказаць на тое, што агульны палавы тыраж усіх выданьняў за дзень у 1919 годзе складае толькі ледзь палову тыражу «Зьвязды».

Усяго друкаваных газэт па БССР: раённых — 68, фабрычна-заводзкіх — 86, дарожных — 14, навуковых — 11, байсковых — 19, саўгасных — 2. Увесь аднаразовы тыраж цэнтральных і раённых газэт вырас з 57.000 экз. у 1924 г. да 881.000 экз. у 1932 годзе.

Зьявіўся новы тып газэты — шматтыражкі, якіх зараз налічваецца 106. Растуць пасьцешныя газэты. Усяго іх выдаецца па БССР 13.500 экз.

Рост нашага друку ёсьць адлюстраваньне бурнага росту сацыялістычнай гаспадаркі, рабочай клясы, прамысловасьці, саўгасаў, і калгасаў, партыі і камсамолу, адлюстраваньне культурнай рэвалюцыі, якая адбываецца зараз у краіне, умацаваньня ўсіх вагароў і прыводных пасоў, што зьвязваюць партыю з рабочай клясай, з найшырэйшымі масамі працоўных, нагляднае і бясспрэчнае адлюстраваньне посьпехаў.

Нашы газэты растуць ня толькі колькасна, але і якасна. Значна ўзьнялася роля нашай прэсы ў барацьбе за генэральную лінію партыі. Ва ўмовах Беларусі гэты рост асабліва відавочны. Былая акраіна царскага самаўладзтва, якая эксплёатавалася капіталізмам, амаль ня мела ніводнай газэты. Бульварныя, прастытуаныя выданьні царскай ахранкі, якія выдаваліся ў Менску і Віцебску, служылі зброяй апэтыкаства і адурачваньня працоўных мас. Толькі рэдка з глыбокага падпольля зьяўляліся бальшавіцкія газэты, якія прапагандавалі, агітавалі і арганізоўвалі працоўныя масы на барацьбу з царызмам.

Царскі ўрад бязьлітасна душыў усякае друкаванае слова, што выдавалася на мовах нацменшасьцяй. Толькі ленінскае ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі партыі забясьпечыла ўсім, бяз выключэньня, працоўным нацыянальных меншасьцяй выданьне на роднай мове газэты. Нагляднасьце, толькі ў аднэй Беларусі выдаюцца ў дзесятках тысяч экзэмплярах газэты па беларускай, яўрэйскай, польскай, расійскай, латыскай, літоўскай, нямецкай, татарскай і іншых мовах. Працоўныя ўсіх нацыянальнасьцяй на роднай мове карыстаюцца друкаваным словам, прымаюць актыў

БРАНЯВІКІ, КУЛЯМЁТЫ, ГАЗАВЫЯ БОМБЫ— для задушэньня антываенных дэманстрацый у Варшаве

Бурныя выступленьні рабочых па ўсёй Польшчы

ВАРШАВА, 2. 31 ліпеня перад мэталюргічнай фабрыкай «Лільпоп у Варшаве адбылася дэманстрацыя рабочых. Перад прысутнымі выступіў камдэпутат Роззнбэрг з заклікам прыняць удзел у антываенных дэманстрацыях 1 жніўня.

Учора ў Варшаве па ўсім горадзе раз'язджалі вялікія атрады паліцыі, бранявікі, грузавікі, перапоўненыя паліцэйскімі. Гарадзкія сады на працягу ўсяго дня былі закрыты для таго, каб перашкодзіць наладжаньню мітынгаў. Антываенныя дэманстрацыі рабочых адбываліся ў розных пунктах гораду. Паліцыя арыштавала 120 удзельнікаў дэманстрацый. Многія рабочыя былі пры разгоне дэманстрацыі зьбіты і паранены.

У Тамашове паліцыя арыштавала групу рабочых, якія расклейвалі першажніўненскія плякаты. У Дамброўскім басэйне арыштаваны 25 чалавек па абвінавачаньні ў арганізацыі дэманстрацыі і распаўсюджаньні антываенных лістовак.

У Чэнстахове зроблены масавыя арышты сярод усіх падазроных у камуністычнай дзейнасьці. У Ловічы арыштавана 30 вучняў настаўніцкай сэмінарыі, галоўным чынам, сялянскія сыны. Яны абвінавачваюцца ў камуністычнай дзейнасьці і ў распаўсюджваньні антываенных лістовак. Рабочая моладзь зрабіла напярэдадні 1 жніўня напад на рэдакцыі фашысцкіх газэт, якія адыгрываюць галоўную ролю ў антысавецкай прапагандзе і прапагандзе вайны.

На днях група дэманстрантаў разьбіла каменьнямі ваконную вітрыну ў будынку рэдакцыі «Ілюстраванага Кур'ера Цодзеннага» ў Кракаве. У Вільні былі выбіты вокны ў рэдакцыі газэты «Слово». У памяшканьне белагвардзейскай газэты «Молва» ў Варшаве былі кінуты бутэлькі з едкай вадкасьцю.

Шматлікія антыфашысцкія дэманстрацыі ў Чэха-Славакіі

ПРАГА, 2. Высокая актыўнасьць рабочых мас у дзень 1 жніўня вылілася ў шматлікіх антыфашысцкіх дэманстрацыях адзінага рабочага фронту. Ня гледзячы на забарону паліцыі, учора адбыліся шматлікія дэманстрацыі, мітынгі і сходы, на якіх рабочыя пратэставалі супроць фашызму, ваеннай небясьпекі і прасьледваньня рабочага руху, асабліва супроць сьмяротных прыгавораў над вэнгерскімі камуністамі. У Празе, у рабочых прыгарадах адбылося 7 мітынгаў, удзельнікі якіх пасьля нападу паліцыі арганізавалі вулічную дэманстрацыю. Арыштавана 15 рабочых, сярод іх камуністычны дэпутат Готвальд. У Брно на мітынг сабралася 2.000 рабочых. Паліцыя арыштавала камуністычных дэпутатаў Юрана і Станіслава і 9 рабочых. У Кладно ў камуністычным мітынгу прымала ўдзел шмат сацыял-дэмакратычных рабочых. У Закарпацкай Украіне, у Мукачэве Ужгорадае рабочыя будаўнікі правялі дэманстрацыйную забастоўку.

Чыгуначная катастрофа недалёка ад Гдыні

ВАРШАВА, 2. Газэты паведамляюць, што 29 ліпеня ў 9 гадзін раніцы здарылася буйная чыгуначная катастрофа з цягнікам, які накіроўваўся ў Гдыню. Цягнік быў перапоўнен дэлегатамі, якія ехалі на «сьвята мора». Па невысьветленых прычынах 4 вагоны зышлі з рэек, 30 чалавек цяжка паранена і два забіты.

ГАЛОДНЫ ПАХОД БЕСПРАЦОЎНЫХ БЕЛАВЕСКАЙ ПУШЧЫ НА БЕЛАВЕЖ

ВІЛЬНЯ. Нядаўна скончылася бурная забастоўка рабочых тартачнікаў у Гайноўцы (Белавеская Пушча). Як вядома, забастоўка выбухнула з прычыны барбарскай эксплёатацыі таго жудаснага становішча, у якім знаходзяцца рабочыя Белавескай пушчы. Нават фашысцкая прэса прызнае, што жыцьцё рабочага ў Белавескай пушчы нічым не адрозьніваецца ад жыцьця «нэгра ў Афрыканскіх калёніях».

Орган польскага сацыял-фашызму «Роботнік», якога нельга западозрыць у згушчэньні фарбаў, так апісвае становішча рабочых у Белавескай пушчы:

«Далёка ад сьвету, ад чыгункі, ад пасьлішчаў, ад цэнтру культуры, школы, доктара, або аптэкі жывуць лясныя рабочыя. Яны зьехаліся сюды з розных канцоў краіны, каб атрымаць работу.

Некалькі год таму назад, калі яны ня мелі дзе жыць, з дазволу фірмы Цэнтура, якая тады эксплёатавала Пушчу і лясьніцтва рабочыя пабудавалі сабе на хуткую руку зямлянкі. Праходзяць гады, а рабочыя разам з сем'ямі жывуць у гэтых гнілых зямлянках. Страха працякае, у сьценах дзіркі, на падлозе вада, смурод, вільгаць. Робіцца жудасна, калі ўбачыш гэтыя норы, у якіх жывуць людзі, па 10-12 чал. у адной зямлянцы ў 5 м. даўжыні і 4 шырыні. Калі падае дождж і праціякае вада, дык людзі ўцякаюць з кута ў кут, каб не прамокнуць. Тут жа, побач за сьцяною стаяць коні, каровы. Апісаць усяго гэтага немагчыма—прызнае нават сацыял-фашысцкі «Роботнік»—трэба ўсё гэта бачыць».

Але гэтага мала. У мэтах трыманьня рабочых у паслухмяністве, каб тым лягчэй было іх эксплёатаваць, фашысцкае кіраўніцтва Пушчы не дазваляе ім рамантаваць зямлянкі, заўсёды пагражае высяленьнем, хаця рабочыя акуратна плацяць арэндную плату за той кавалачак зямлі, на якім пабудавана гэта «сабачая буда».

Рабочым прыходзіцца пераносіць з боку адміністрацыі ганебныя зьдзекі. У тым жа самым нумары сацыял-фашысцкая газэта падае наступныя факты:

«У Чэрляйцы побач з домам лясьнічага жыў ў доміку рабочы з сям'ёй. Калі гэты рабочы выехаў, дык лясьнічы паставіў у гэтым доміку сваю жывёлу, ня гледзячы на тое, што меў добры хлеў. А між тым тут жа побач жыла «у сабачай будзе» сем'я рабочага з 5 душ з малымі дзецьмі. Зямлянка гэта мела 2 з пал. мэтры даўжыні і шырыні 1 з пал. мэтры вышыні. Як зазначае сацыял-фашысцкі брахун раней гэта зямлянка служыла для хаваньня бульбы».

Зразумела, што гэта далёка ня поўны малюнак тых жудасных умоў, у якіх жывуць рабочыя, асабліва беспрацоўныя ў Белавескай пушчы.

Зараз фашысцкая прэса падае аб новым масавым звальненьні рабочых у Белавескай пушчы. Беспрацоўныя ніякай дапамогі не атрымліваюць і кінуты на галодную сьмерць. **Па ініцыятыве беспрацоўных з тартаку у Пасуцінскіх Будах беспрацоўныя ідуць галодным паходам на Белавеж дабівацца працы і хлеба.**

Эстонскі парлямант ратыфікаваў дагавор аб ненападзе

ТАЛІН, 2. Сёньня парлямант ратыфікаваў савецка-эстонскі дагавор аб ненападзе.

Паражэньне стаўленьнікаў ангельскага імпэрыялізму

ЛЁНДАН. 2. Паводле паведамленьня агенцтва Рэйтэр, з Джэдзі войскі Ібн-Сауда акружылі і зьнішчылі сілы паўстанцаў. Сражэньне адбылося ў Джэбэльшары ля Дзібі. Паўстанцы страцілі 370 чалавек забітымі. Правадыр паўстанцаў Рыфада быў узяты ў палон і зараз-жа абязглаўлены. Некаторыя ангельскія газэты, камэнтуючы падзеі ў Гаджасе, праводзілі ў апошні час на сутнасьці замаскаваную кампанію супроць вахабітаў, правадыром якіх зьяўляецца Ібн-Сауд. Выказваюць меркаваньне, што рух паўстанцаў быў інсьпіраваны ангельцамі.

За бальшавіцкую гісторыю заводаў БССР

Пастановаю ад 10 кастрычніка 1931 г., ЦК УсеКП(б), ухваліўшы ініцыятыву т. **М. Горкага**, прапанаваў прыступіць да выданьня «Гісторыі заводаў СССР».

Напісаньне «Гісторыі заводаў» мае вялікае палітычнае значэньне.

«Гісторыя заводаў» павінна стаць бальшавіцкім паказам гістарычнай практыкі ба рацьбы пралетарыяту за сваю дыктатуру, паказам практыкі яго перамогі і пераможнага будаўніцтва сацыялізму. Гэтым самым «Гісторыя заводаў» павінна зьявіцца магутным сродкам палітычнага выхаваньня шматтысячных кадраў новых рабочых і ўзрастаючага пакаленьня пралетарскай моладзі, магутным сродкам мабілізацыі мас на далейшае пасьпяховае будаўніцтва сацыялізму.

Разам з тым «Гісторыя заводаў» павінна стаць канцэнтрацыяй баявога гістарычнага вопыту і вопыту будаўніцтва сацыялізму для міжнароднага пралетарыяту, паслужыць яму зброяй у змаганьні за перамогу сацыялізму ва ўсім сьвеце.

Бальшавіцкае асьвятленьне гісторыі паших заводаў, бальшавіцкі паказ нашай будоўлі—магутны ўдар па ныццікам, малаверам, рознага роду апартуністам, якія на вераць у творчыя сілы пралетарыяту, у яго вялікія гістарычныя дасягненьні.

Вырашэньне вялікай палітычнай задачы—стварэньне гісторыі фабрык і заводаў—магчыма толькі пры актыўным удзеле шырокіх колаў рабочых мас, ударнікаў, рабкораў, таспадарчых, інжынэрна-тэхнічных, навукова-дасьледчых, літаратурных работнікаў, настаўніцтва і работнікаў па фронце гісторыі, пры актыўным удзеле заводзкіх партыйных і камсамольскіх ячэек, фабкомаў і адміністрацыі, пад кіраўніцтвам агульна-гарадзкіх партыйных і прафсаюзных органаў.

Асабліва вялікі ўдзел у гэтай працы павінны прыняць гісторыкі-марксысты і работнікі гістарычнага фронту. Удзел у складаньні бальшавіцкай гісторыі заводаў—справа гонару кожнага гісторыка. Ніадзін з іх не павінен застацца ў баку ад выкананьня бальшавіцкіх абавязкаў у галіне гістарычнай навукі. ЦК партыі ў пастанове аб напісаньні «Гісторыі заводаў» патрабуе ад кожнага гісторыка актыўнага ўдзелу, баявых бальшавіцкіх тэмпаў і высокай ідэалёгічнай якасьці работы.

Аспоўнае кіраўніцтва гэтай вялікай работай ва ўсесаюзным маштабе праводзіцца галоўнай рэдакцыяй «Гісторыі заводаў», якая зацьверджана пастановай ЦК УсеКП(б) ад 10-га кастрычніка 1931 г. Галоўнай рэдакцыяй дана дырэктыва і аспоўныя ўстаноўкі праграмнага і арганізацыйнага парадку аб тым, як пісаць гісторыю заводаў.

У нас, на Беларусі пастановаю ЦК КП(б)Б утворана прадстаўніцтва галоўнай рэдакцыі для дапамогі па выданьні «Гісторыі заводаў на Беларусі».

Для непасрэднай арганізацыі і апэрацыйнага кіраўніцтва работай па напісаньні гісторыі заводаў БССР, пры Інстытуце Гісторыі Беларускай Акадэміі Навук утворан Сакратарыят, які ў хуткім часе апублікуе прыкладную праграму «Гісторыі заводаў БССР».

Неабходна зараз-жа разгарнуць работу па напісаньні гісторыі наступных заводаў: завод імя **Варашылава**, завод **«Бальшавік»**, ф-ка **«Кастрычнік»**, завод **«Чырвоная зорка»**, гута **«Пралетары»** у Менску; ф-ка **«Прафінтэрн»**, **панчошна-трыкатажная фабрыка**; ф-ка **«Дзьвіна»** ў Віцебску; **Гомсельмаш**, завод імя **Ланцуцкага** ў Гомелі; **«Герой працы»**—Добруш; **«Пралетарская перамога»**—Нова-Барысаў; **ф-ка шоўку**—Магілеў; цэмэнтны завод—**Крычаў**.

Гэты сьпіс можа быць папоўнен за лік тых заводаў, якія ўжо распачалі працу, а таксама якія самі непасрэдна праявяць ініцыятыву па напісаньні сваёй гісторыі.

Ударнай калектыўнай працай напішам бальшавіцкую гісторыю нашых заводаў. Пакажам пралетарыят БССР ва ўсёй яго велічыні, як тварца новага жыцьця. Пакажам яго рост і геройства, яго непарыўнасьць і брацкае супрацоўніцтва з пралетарыятам усяго СССР—ударнай брыгадай сусьветнай рэвалюцыі, якая пад кіраўніцтвам ленінскай партыі пераможна будуе сацыялізм.

Дырэктарыят інстытуту Гісторыі БАН.
Сакратарыят па складаньні «Гісторыі фабрык і заводаў БССР».

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

25 жніўня першая чарга Днепрабуду будзе гатова

Паводле слоў галоўнага інжынэра Днепрабуду акадэміка Б. Е. Ведзянева, у сучасны момант з 3-х змантаваных на дніпроўскай гідраэлектрастанцыі агрэгатаў працуюць два (адзін у рэзэрве). Яны даюць зараз каля 20 тыс. квт. энэргіі. 3 іх 12 тыс. перадаецца Днепрапятроўску, астатнія 8.000 ідуць пакуль што на ўласныя патрэбы будаўніцтва і станцыі. Агрэгаты працуюць далёка не на поўную магутнасьць, галоўным чынам таму, што спажыўцы аказаліся непадрыхтаванымі да прыёму энэргіі.

4-ы агрэгат стаіць на сушы і ў пачатку жніўня можа быць пушчан у эксплёатацыю. 5-ты будзе гатоў да пуску 25 жніўня.

Машынабудаўніцтва

Машынабудаўнічы завод імя Варашылава ліпеньскі прамфінплян выканаў на 105,2 проц. Выпушчана 79 сьвідравальных варштатаў, 5 гравіясартовак, 8 кампрэсарабілак «Акмэ», 16 кормазапарнікаў, 10 тажарных варштатаў.

Сельгасмашыны

Гомсельмаш 28 ліпеня выпусьціў 30 сілаграбзак «Папэк», што складае 125 проц дзеннага заданьня; 15 сячкарань—94 проц. і 16 бульсартовак—100 проц.

29 ліпеня выпушчана 26 сілаграбзак «Папэк»—108 проц. пляну, 16 сячкарань—100 проц. і 12 бульбасартовак—75 проц

Будматар'ялы

Рагачоўскі лесазавод імя Халтурына за 28 ліпеня расьпілаваў 285,1 кубамэтраў бярвеньня—99 проц. дзеннага заданьня.

***

На заводзе **«Чырвоны кастрычнік»** 28 ліпеня выпушчана 8,3 тоны будаўнічых цьвікоў, або 161,7 проц. дзеннай праграмы; 29 ліпеня—8, 4 тоны—162,3 проц. і 30 ліпеня—7,4 тоны, або 145,8 проц.

***

На фабрыцы **«Чырвоная зорка»** 28 ліпеня выраблена 7,5 тоны паперы, або 18,5 % дзеннага заданьня; 29 ліпеня—20,2 тоны—50.2 проц. і 30 ліпеня—16,9 тоны або 42,2 проц.

***

Фабрыкай **«Спартак»** за 28 ліпеня выпушчана 18,9 тоны паперы, або 95,4 проц. дзеннага плану.

***

За 25 ліпеня на заводзе **«Інтэрнацыянал»** выпушчана 555 скрынь цьвікоў—93,7 проц. дзеннага пляну і 672 кілё вінтоў—62,1 проц.; 26 ліпеня—553 скрыні цьвікоў—92 проц. і 644 кілё вінтоў—69,2 проц. і 27 ліпеня—563 скрыні цьвікоў—94,8 проц. і 637 кгр. вінтоў—68 проц.

Папера

Добруская папяровая фабрыка «Герой працы» за 27 ліпеня выпусьціла 43 тоны паперы—44.7 проц. дзеннай праграмы. 28 ліпеня—37,7 тоны—38,5 проц.; 30 ліпеня—33,8 тоны—41,3 проц. і 31 ліпеня—45,2 тоны—46,9 проц.

***

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

Разьвіцьцё-Далёка-Ўсходняга краю

ХАБАРАЎСК, (ТАСС). Распрацаван арыентовачны плян другой пяцігодкі для **Далёка-Ўсходняга краю.** Аспоўная ўвага гэтай пяцігодкі згуртоўваецца на разьвіцьці прамысловасьці краю і ў першую чаргу на Хінгана-Бурэйскай праблеме. У раёне знаходжаньня Хінганскай руды і Бурэйскага вугалю будзе пабудован мэталюргічны камбінат з дзьвюма домнамі прадукцыйнасьцю **ў 430 тыс. тон чыгуну.** Здабыча ж вугалю будзе даведзена **да 14 млн. тон**, а нафты—**да 2 млн. тон у год.**

У гэтым годзе ў сувязі з такім намячэньнем другой пяцігодкі будзе аддана вялікая ўвага вывучэньню нэтраў краю, для чаго ў розныя раёны савецкага Далёкага Ўсходу адпраўлена 229 разьведвальных партый.

У галіне сельскай гаспадаркі да 1937 году мяркуецца давесьці плошчу зямлі пад ворыва **да 3,5 млн. гэкт.** Зараз прыступлена ўжо да вопытаў разьвядзеньня масьлічных тэхнічных культур, цукровых буракоў, ільну, канапель і сланэчніку. У некаторых раёнах вельмі пасьпяхова скончаны вопыты з вырашчваньнем эгіпэцкага баваўняніку.

У лёгкую прамысловасьць Далёка-Ўсходняга краю прапанавана ўкласьці **158 млн. руб.**, пабудаваўшы новыя прадпрыемствы ў тэкстыльнай, запалкавай, скурана-абутковай, швэйнай і паліграфічнай прамысловасьцях.

У канцы другой пяцігодкі край будзе мець настолькі шырока разьвітую прамысловасьць, што зусім вызваліцца ў радзе галін ад экспарту з цэнтральных раёнаў Савецкага Саюзу.

Хінган

УЛАДЫВАСТОК. Адкрыцьцё ў Хінгане пакладаў жалезнай **руды**, а ў раёне Бурэя—**вугалю** для Далёкага Ўсходу мае першараднае значэньне. Ня трэба забываць, што бліжэйшы мэталяпрацоўчы раён—Кузбас—знаходзіцца ад Хабараўску і Уладывастоку на адлегласьці 5.900 клм. Магнітагорск ад Хабараўску на адлегласьці 6.800 клм. Відома, пры такой адлегласьці дастаўка мэталу ў Далёка-Ўсходні край зьяўлялася б эканамічна дарагім мерапрыемствам з-за вялізарных транспартных расходаў.

У мінулым годзе геолёга-разьведчыя партыі пад кіраўніцтвам інжынэра **Відгефта**, робячы абсьледваньне Малога Хінгану, на першы час знайшлі каля **63 млн. тон** руды, а ў наступным было ўстаноўлена, што гэтыя запасы дасягаюць ужо **каля 300 млн. тон.** Раён гэты надзвычай зручны для распрацовак, бо знаходзіцца ў 30 клм. ад Усурыйскай чыгункі.

Акрамя руды, у пэтрах Малога Хінгану знойдзены **золата, высокагатуйковы мормур-саждцвет, радыё-актыўныя мінэралы** і г. д.

Але наяўнасьць жалезнай руды без адпаведнай вугальнай базы значна зьніжала б эканамічную каштоўнасьць гэтай мэталюргічнай базы. Аднак, яшчэ адначасова з находкай руд у Хінгане быў адкрыт у раёне Тырмо-Бурэя вялізны вугляносны раён, які знаходзіцца на адлегласьці паўтараста кілёмэтраў ад Хінгану і ў ста кілёмэтрах ад лініі Усурыйскай чыгункі. Раён аханяе плошчу даўжынёю ў 200 клм. Ужо зараз пры самым павярхоўным дасьледваньні зной дзен рад рабочых пластоў вугалю. Апальваньне гэтага вугалю, нават на вогнішчы, дало масу, якая каксуецца. Геалёгічныя запасы, паводле папярэдніх падлікаў, акрэсьліваюцца **ў 10 млрд. тон.** (ТАСС).

Паход „Малыгіна" ў Арктыку

МАСКВА. 1 жніўня ледакол «Малыгін» з групай навуковых работнікаў і інтурыстаў адпраўляецца ў ледавы паход у Арктыку.

«Малыгін» пойдзе на Зямлю Франца-Іосіфа, правядзе абсьледваньне архіпэлагу для таго, каб сьцерці «белыя плямы» з карты Арктыкі.

На Зямлі Франца-Іосіфа чужаземныя турысты па магутным самалёце разам з Савецкімі навуковымі работнікамі зробяць абсьледваньне Зямлі Франца-Іосіфа і арх.-ледаколу будуць праведзены, вялікія навуковыя работы, будзе арганізавана паляваньне на палярных зьвяроў і г. д.

На Зямлі Франца-Іосіфа «Малыгін» разгрузіць запасы прадуктаў і матар'ялаў, якія ён вязе для зімоўшчыкаў, захопіць будаўнікоў і зробіць зваротны рэйс праз Новую Зямлю. Тут з ледаколу будзе зданя пошта і на самалёце яна будзе дастаўлена ў Архангельск.

Начальнікам экспэдыцыі і яе навуковым кіраўніком пазначан тав. **Пінегін**—неадназразовы ўдзельнік арктычных экспэдыцый; капітанам—**Чартыскі**, які вёў ледакол і ў першым турысцкім паходзе.

Арктычны паход «Малыгіна» выклікаў за мяжой вялікую зацікаўленасьць. Сярод жадаючых прыняць удзел у паходзе на Зямлю Франца-Іосіфа знаходзіцца відомы дасьледца Арктыкі **Фрэдэрык Джэксон.** Яшчэ ў 1924 годзе ён быў кіраўніком экспэдыцыі на Зямлю Франца-Іосіфа (экспэдыцыя Джэксона — Гасмуорта), дзе ён прабыў тры гады. На Зямлі Франца-Іосіфа адбылася сустрэча Джэксона з Нансэнам і Егансэнам, якія прабавалі дабіцца да Паўночнага полюсу. Фрэдэрыку Джэксону цяпер 72 гады.

Наркамсувязі выпусьціў спэцыяльныя маркі, прысьвечаныя 2-му міжнароднаму палярнаму году і паходу «Малыгіна» ў Арктыку. (ТАСС).

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Усім сакратаром партканектываў і ячэйкам КП(б)Б

На аснове пастановы Бюро ад 31-VII-32 г. прапануецца вам 7-га жніўня правесьці агульныя партыйна-камсамольскія сходы з прыцягненьнем шырокіх мас рабочых, калгасьнікаў і служачых, прысьвечаныя 15-цігодзьдзю «Зьвязды».

Сакратар Менгаркому КП(б)Б ШПЭКТАРАЎ.

Сьпіс дакладчыкаў прыкладаецца.

СЬПІС

дакладчыкаў Менгаркомам КП(б)Б па правядзеньні партдзён у сувязі з юбілеем „Зьвязды" і пяцігодзьдзя пераходу ня на беларускую мову

Сенецкі с.-с.—МАРОЗАЎ («Рабочий»), Ратамскі с.-с.—МАЛЕКІН (Радыё), Падгайскі с.-с.—ПУЗІКАЎ («Рабселькор»), Каладзішчанскі—БЕРАЗОЎСКАЯ («Зьвязда»), Новавяворскі с-с.—ЖАРСКІ («Орка»), А-Гарадзецкі с.-с.—ПРЫНЦ («Орка»), Папярнянскі с.-с.—КЛІМКОВІЧ (ЦСПСБ), Строчыцкі с.-с—БРАЎДА («Рабочий»), Каралішчанскі с.-с.—ВАЙЦЯХОВІЧ (Белта), Гатаўскі с.-с.—СТАЛЗЛІС—(Літоўская).

— 4-га жніўня, роўна ў 12 гадз. дня, у 23 пакоі Менгаркому КП(б)Б адбудзецца нарада па пытаньні работы агітканектываў. На нараду павінны зьявіцца сакратары партканектываў наступных прадпрыемстваў: зав. імя Молатава, «Бальшавік», «Камунар», «Полымя Рэвалюцыі», «Ударнік», дэпо, ф-к: «Кастрычнік», абутковай, імя Крупскай, друк. імя Станіна і наступныя т. т.: Вільчак — ПК, Адам — ЦСПСБ, Герчыкаў — ГК, Вальхоўскі—ГК, Мінц — ГК, Майзель Ю. — гістпарт, Альперовіч — міліцыя, Дзяржплян, Серафімаў — БАН, Вайбанава — НКЮ, Клімковіч — ЦСПСБ, Эйдман, Балотнікаў, Трус, Леўкова, Рымша — гістпарт, Гурчынко — Белдзяржкіно, Ракоўсаўбуд, Рыўкін — НКЮ, Гершман — ЦКК.

— Сьпіс дакладчыкаў, вылучаных Менгаркомам КП(б)Б для дакладаў на прадпрыемствах аб рэвалюцыйнай законнасьці. Файнбург (НКЮ) — завод «Бальшавік», Леўкоў (НКЮ) — зав. імя Варашылава, Мар'ясіна (НКЮ)—ф-ка «Кастрычнік», Кісельгоф (НКЮ) — зав. «Камунар», Фрэдзін (НКЮ) — зав. «Пралетары», Шнітко (Гарпракур.) — абутковая ф-ка, Зефман — ф-ка «Камунарка», Рыўкін (НКЮ) — «Полымя Рэвалюцыі», Хіліманад (ЦВК) — ф-ка «8 сакавіка», Левін (НК-РСІ) — ф-ка імя Крупскай, Халасевіч (гарКК) — Менбуд, Гершан (НК-РСІ — служба цягі (чыгунка). Парткалектывам і ячэйкам КП(б)Б даказарыцца з вылучанымі таварышамі аб часе і месцы дакладаў.

ПАДВОДЗІМ ВЫНІКІ КОНКУРСУ „ПРАВДЫ"

Сёньня, 4-га жніўня у памяшканьні Дому Пісьменьніка адбудзецца

ЗАКЛЮЧНАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ

КАМІСІІ ПА КІРАЎНІЦТВЕ КОНКУРСАМ „ПРАВДЫ"

На пасяджэньне запрашаюцца ўсе члены цэнтральнай конкурснай камісіі БССР, работнікі цэнтральных газэт, прадстаўнікі Наркамзему, Калгасцэнтру, ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ, рэдактары фабрычна-заводзкіх шматпражак гор. Менску, члены рэдкалегій насьценных газэт і рабкоры, прадстаўнікі парт'ячэек і фабзаўмясцкомаў, асьветнікі і ІТР.

Пачатак а 6 гадз. увечары.

Цэнтральная камісія па кіраўніцтве конкурсам пры «Зьвязьдзе».

Правілы прыёму ва ўсебеларускі палітыка-асьветны інстытут на 1932-33 навучальны год.

(Асобныя прыём)

1. Палітыка-асьветны інстытут мае мэту падрыхтаваць палітасьветных работнікаў з вышэйшай кваліфікацыяй па асобных галінах палітасьветнай работы (раённыя інструктары і інспэктары палітасьветнай работы, загадчыкі палітасьветустаноў, супрацоўнікі навуковых бібліятэк, музэяў і інш., сакратарары раённых газэт).

У адпаведнасьці з гэтым пры інстытуце існуюць спэцыяльныя аддзяленьні:

1) арганізацыйна-інструктарскае,
2) бібліятэчна інструктарскае,
8) масава-інструктарскае,
4) газэтнае.

2. На першы курс бяз іспытаў прымаюцца асобы, якія маюць закончаную сярэднюю асьвету а таксама і тыя, што скончылі курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ і ВТНУ.

Усе іншыя павінны трымаць іспыты ў аб'ёме ведаў сярэдняй школы (9-цігодкі).

3. У палітыка-асьветны інстытут на аддзяленьні: газэтнае, арганізацыйна-інструктарскае і масавай палітыка-асьветнай работы прымаюцца члены і кандыдаты КП(б)Б і КСМ, якія маюць ня менш, як двухгадовы стаж актыўнай партыйнай, камсамольскай або грамадзкай работы.

На бібліятэчнае аддзяленьне прымаюцца і беспартыйныя з 2-гадовым стажам грамадзкай работы.

Узрост паступаючых ад 17 да 35 год.

У інстытут ня прымаюцца асобы з заразьлівымі хваробамі, хворыя нэўрасьтэніяй у клінічнай форме, сухотамі і зусім фізычна слабыя.

4. Паступаючыя ў палітыка-асьветны інстытут павінны падаць на імя раённых і гарадзкіх камісій, што існуюць пры райкомах і гаркомах КП(б)Б, заяву з указаньнем аддзяленьня і далучыць наступныя дакументы: 1) аб узросьце, 2) адносінах да службы ў Чырвонай арміі, 3) аб асьвеце, 4) аб стане здароўя, 5) аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў, 6) для аднаасобнікаў—адпаведны дакумант аб сельгаспадатку на 1932 г., 7) даведку аб двухгадовым стажы для асоб, скончыўшых тэхнікумы і ФЗВ), 8) характарыстыку мясцовай партыйнай або камсамольскай ячэйкі, 9) анкету, засьведчаную савецкімі або прафэсіянальнымі ўстановамі і арганізацыямі раённага маштабу, 10) 2 фатаграфічныя карткі.

Дакументы аб асьвеце дасылаюцца толькі ў арыгіналах; формы анкеты тыя-ж, як і для усіх вышэйшых навучальных устаноў.

Тэрмін прыёму дакументаў з гаварадыроўкамі ў інстытут 15 жніўня па адрасе: Магілеў, Камсамольская, 28.

5. Тыя асобы, якія камандыруюцца ў палітасьветны інстытут, забясьпечваюцца мясцовымі арганізацыямі сродкамі і апрача таго, работнікам павінна быць выдана пэнсія за два тыдні ўперад. За невялічнымі захоўваецца пасада, якую яны займалі раней.

6. Запічаныя студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам, стыпэндыяй па вызначаных нормах, падручнікамі і пісьмовымі прыладамі.

Студэнты павінны мець свае пасьцельныя прылады. Інстытут не забясьпечвае кватэрамі сем'і студэнтаў.

Заняткі на першым курсе пачынаюцца 1-га кастрычніка.

7. Раёны камандыруюць: Менскі Віцебскі, Гомельскі і Магілеўскі ня менш чым па 6 чал., астатнія раёны—ня менш чым па 4 чал.

Дырэкцыя Інстытуту.

Летні тэатр саду „ПРАФІНТЭРН"
Сёньня і штодзённа
5-ы цыкль 5-ы цыкль
„МЮЗІК-ХОЛ"
Пачатак у 9 гадз. вечара.

„Чырвоная Зорка" — Сёньня і штодзённа Пуцёўка ў жыцьцё
„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Усходні мастацкі фільм ЧАДРА. Зьвыш прагр. хроніка Саюзкіно.
Кіно „Пралетары" — Дзённыя дзіцячыя сэансы мастацкі фільм ІХНЯЯ ВУЛІЦА
„СПАРТАК" — Мастацкі фільм РУБІКОН драма ў 7 частках

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"
НІНА ЛІ
ў мастацкім фільме
ЗА МАНАСТЫРСКАЙ СЬЦЯНОЙ
у 7 частках.

5-VIII у 7 гадзін веч. у памяшканьні рэдакцыі газэты „Зьвязда" адбудзецца

АДКРЫТЫ АГУЛЬНЫ СХОД

партканектыву цэнтральных газэт

з парадкам дня:

Даклад аб юбілею газэты „Зьвязда".

Яўка ўсіх партыйцаў абавязкова. Запрашаюцца і беспартыйныя.

Менкамгас паведамляе, што 4 жніўня, у 18 з пал. гадз. склікаецца

НАРАДА

ўсіх трыпутэйнаў камунальных прадпрыемстваў, падпарадкаваных Менкамгасу

(жылтрэст, вадаканалтрэст, транспартрэст, электрастанцыя, гужпарк, кар'ерныя распрацоўкі, асабоз, кір. гасьцініц, лазьні і пральні, буд. к-ра, трэст зялёных насаджэньняў, пажарная ахова), а таксама запрашаюцца: прадстаўнік ЦК саюзу камунальн. прадпрыемстваў, Нач. Менгарміліцыі, старшыня камунальнай сэкцыі, прадстаўнік вадатрэсту НКЗВ, дырэктар сантэхбуду, дырэктар бэтоннага заводу.

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Аб задачах правядзеньня месячніка дабрабыту на аснове пастановы Гаркому КП(б)Б і пленуму Менгарсавету (дакл. т. Глейбэрман).

2) Аб структуры абслугоўваньня камунальнай гаспадаркі.

Нарада адбудзецца ў памяшканьні клюбу вольна-пажарнага т-ва (Рэспубліканская вул.).

Менкамгас.

Тэлефоны рэдакцыі: Адказны рэдактар—4-27; сакратарыят—10-74; сэктары: партыйнага будаўніцтва—13-80; эканамічна-прамысловы—13-80; калгасрацыі і снабжэньня—13-80; вайсковы-палітычны—13-80; транспартны—6-19; сацыялістычнага зямляробства—6-19; замежнай інфармацыі—6-19; сэктар ударных брыгад—6-19; аддзел рабочых і калгасьнікаў—6-19; культурнага будаўніцтва—6-19, агляду друку—6-19; бібліяграфіі—6-19; бюро расьсьледваньня—6-19.
Тэлефоны канторы: Загадчык канторы—7-81; аддзел аб'яў і бухгальтэрыя—7-81.
Адрас рэдакцыі: Менск, Савецкая, 33.
Менск, друкарня «Зьвязда».
Галоўлітбел № 337.